Як зрабіць так, каб нашы жанчыны захацелі нараджаць, і не проста адно дзіця, але і дваіх-траіх і больш? Можа, паспрабаваць максімальна аблегчыць ім жыццё? СТАР 3

Бліны з мукі ў беларускіх гаспадынь чаргаваліся з блінамі з бульбы, якія называліся «бульбянікамі» (або «гульбішнікамі»). Знаўцы побыту мясцовага насельніцтва маглі па блінах на стале распазнаць стан спраў у сям'і. СТАР 7

Дарога, якая злучае сядзібы, нездарма называецца «Шляхам Коласа». Яна пабудавана па просьбе самога пісьменніка, а ў 1990-1992 гг. была ўпрыгожана ўнікальнымі драўлянымі скульптурамі. СТАР 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. АЎТОРАК № 210 (27325) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МАКСІМАЛЬНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ПЕРАВАГІ АЭП

БЕЛАРУСЬ і Расія павінны максімальна выкарыстоўваць перавагі Адзінай эканамічнай прасторы, у тым ліку ў развіцці сувязяў з рэгіёнамі. Аб гэтым заявіў 29 кастрычніка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Краснаярскага края Расійскай Федэрацыі Львом Кузняцовым.

«Апошнім часам адносіны паміж нашымі брацкімі дзяржавамі развіваюцца здавальняюча. Я адзначаю высокую дадатную дынаміку ў адносінах», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, Мытны саюз і Адзіная эканамічная прастора адкрываюць новыя вялікія магчымасці для развіцця эканомік, унутранага і знешняга гандлю, прамысловай кааперацыі, павышэння дабрабыту людзей.

«На інтэграцыйныя працэсы ў беларусаў і расіян асаблівыя спадзяванні. Ва ўмовах усёабдымнай міжнароднай канкурэнцыі ўвогуле няма часу на разварушванне, асабліва з улікам уступлення Расіі ў СГА. Неабходна эфектыўна выкарыстоўваць перавагу ад зняцця тых бар'ераў, што існавалі раней, у тым ліку ў нашым гандлі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва мацнее і прырастае сувязямі з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. «Краснаярскі край для нас — перспектыўны і надзейны партнёр не толькі ў сферы гандлю. Некалькі тысяч кіламетраў, якія раздзяляюць Мінск і Краснаярск, не могуць перашкаджаць умацаванню нашых адносін», — сказаў Прэзідэнт. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, аб'ём узаемнага гандлю Беларусі з Краснаярскім краем за апошнія тры гады павялічыўся ў два разы, склаўшы ў 2011 годзе амаль $132 млн...

Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што беларускі бок гатовы максімальна аператыўна разгледзець любыя прапановы з мэтай актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва. «Мы хочам, каб гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва садзейнічала захаванню сувязяў паміж нашымі народамі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Леў Кузняцоў запэўніў, што Краснаярскі край зацікаўлены ў развіцці ўзаемадзеяння з Беларуссю па ўсіх напрамках, у тым ліку ў сферы высокіх тэхналогій. «Мы атрымалі права развіваць ядзерна-касмічны кластар, таму што 90 працэнтаў мірнай спадарожнікавай праграмы распрацоўваецца, праектуецца, будуецца і пасля суправаджаецца ў горадзе Жалезнагорск, які размешчаны ў Краснаярскім краі», — адзначыў ён.

Паводле слоў губернатара, для Краснаярскага края таксама цікавы беларускі вопыт развіцця сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў, горадабудаўнічай палітыкі, транспартнай інфраструктуры. Паколькі ў Краснаярскім краі пражываюць нямала беларусаў, вялікая зацікаўленасць ёсць і да развіцця культурных сувязяў. «Партнёрства з вамі для нас вялікі гонар, у нас ёсць шырокі спектр для развіцця супрацоўніцтва», — упэўнены губернатар Краснаярскага края.

У цэлым на сустрэчы адбыўся шырокі абмен думкамі па пытаннях развіцця інфраструктуры ў вёсцы, адукацыі, аховы здароўя, моладзевай палітыкі, спорту.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

БЕЛАРУСЬ РАЗЛІЧВАЕ НА НОВУЮ ПРАГРАМУ З МВФ

АБ гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з кіраўніком місіі МВФ Дэвідам Хофманам, перадае БЕЛТА.

«Мы лічым, што Беларусь з улікам вялікай праведзенай работы можа разлічваць на праграму з фондам», — заявіў Міхаіл Мясніковіч. «І я лічу, што гэта будзе даведзена да выканаўчых дырэктараў і да палітычнага кіраўніцтва фонду», — дадаў ён...

«Падтрымліваючы ў прынцыпе высновы камісіі, я хацеў бы адзначыць, што па некаторых пазіцыях я лічыў бы, што, магчыма, у вас не было дастаткова інфармацыі, і ў гэтай сітуацыі высновы назіраюцца не зусім аб'ектыўныя», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

«Я думаю, у вас з'явілася магчымасць пераканацца ў тым, што ўрад з Нацыянальным банкам паслядоўна забяспечвалі стабілізацыю эканомікі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч, адзначыўшы, што гэта ў нейкай ступені адпавядае тым рэкамендацыям, якія былі прадстаўлены папярэдняй місіяй.

У першую чаргу, быў стабілізаваны стан спраў на валютным і спажывецкім рынку. «Мы выйшлі на бездэфіцытны бюджэт, забяспечваем рост золатавалютных рэзерваў. Пры гэтым цалкам забяспечваем абслугоўванне знешняга доўгу і плануемая бюджэтныя назначэнні. Калі паглядзець на сальда нашага знешнегандлёвага балансу, яно таксама дадатнае і, нават калі выкарыстоўваць методыку розных рахункаў, розных падыходаў, то мы дастаткова паспяхова прадаём на экспарт прадукцыю вытворча-тэхнічнага прызначэння і сельскай гаспадаркі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Дэвід Хофман у сваю чаргу адзначыў, што на працягу апошніх двух тыдняў у прадстаўнікоў місіі МВФ адбыліся вельмі канструктыўныя дыскусіі з калегамі з Нацыянальнага банка, урада і з іншымі бакамі. «Я рады, што ў нас ёсць магчымасць сёння абмеркаваць з вамі нашы высновы», — сказаў кіраўнік місіі МВФ.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДЗЕЙНАЯ РАЗУМНАЯ СУВЯЗЬ!

ПЯТЫ год Лідзія Жыгаліна працуе паштальёнам на першым участку паштовага аддзялення Хатовіж Клімавіцкага раёна. Кажа, што прыйшла часова падмяніць аднавяскоўку на час дэкрэтнага адпачынку ды так і засталася разносіць газеты, часопісы і лісты па трох суседніх вёсках.

— Акрамя перыёдыкі, мне даводзіцца прыносіць падпісчыкам крупы, хлеб, лекі. Як адмовіць старым і хворым людзям, калі ў іх няма ні родных, ні памочнікаў? А мне вельмі прыемна дапамагаць ім, — кажа Лідзія Васільеўна.

Штодзень у любое надвор'е побач з паштальёнам крочыць яе чатырохногі спадарожнік і памочнік па мянушцы Разумка. Сабака ведае, якую газету ў які двор трэба аднесці і з задавальненнем выконвае просьбы гаспадыні. Жыхары вёсак Хадунь, Ганнаўка і Хатовіж яшчэ здалёк пазнаюць чаканага паштальёна і яе паслухмянага памочніка.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«АБНОЎЛЕНЫ ПАРЛАМЕНТ НАСТРОЕНЫ НА ПРЫНЯЦЦЕ ЎЗВАЖАНЫХ І АДКАЗНЫХ ЗАКАНАДАЎЧЫХ РАШЭННЯЎ, ЯКІХ І ЧАКАЮЦЬ АД НАС ЛЮДЗІ»

Перавыбраны на новы чатырохгадовы тэрмін Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў інтэрв'ю «Звяздзе» падзяліўся сваімі меркаваннямі па некаторых пытаннях парламенцкага жыцця

— Уладзімір Паўлавіч, у крытыцы парламента апазіцыя перманентна жангліруе тэзісам, што Палата прадстаўнікоў нічога не вырашае. Якая ваша думка на гэты конт?

— Гэта маніпуляцыя дзеля фарміравання ў грамадскай свядомасці скажонага ўяўлення аб парламенце і рабоце дэпутатаў і атрымання сваёй палітычнай выгады, а проста кажучы — хлусня. Калі якоенебудзь заканадаўчае рашэнне ім недаспадобы, то яны ўсчынаюць лямант, падключаючы да яго і сваіх заходніх фундатараў, каб рашэнне было скасавана. Вось і «не вырашае»... Паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў, заснаваныя на прынцыпе падзелу галін дзяржаўнай улады, вызначаны ў 4-й главе Асноўнага Закона — усенародна прынятай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў Законе «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь» і іншых заканадаўчых актах. Палата прадстаўнікоў працуе, падкрэсліваю, выключна ў канстытуцыйным рэчышчы. Зразумела, радыкалаў гэта злуе, таму што яны так і не навучыліся паважаць дзяржаву, у якой жывуць, яе заканадаўства і наш беларускі народ, які беспаспяхова імкнуцца зрабіць заложнікам сваіх асабістых поглядаў. Мінулыя парламенцкія выбары яшчэ раз пераканаўча пацвердзілі, што апаненты ўлады па-ранейшаму знаходзяцца ў апазіцыі да народа.

— Мяркуючы па заявах радыкальных партый, яны выкарысталі парламенцкі марафон толькі ў прапагандысцкіх мэтах і на дэпутацкія мандаты не разлічвалі.

— А на што ім было разлічваць? На сваю адарванасць ад грамадска-палітычных рэалій у краіне, ад жыццёвых клопатаў абсалютнай большасці людзей? Зрабілі стаўку на нулявы вынік — і атрымалі нулявы вынік.

— Мандат дэпутата парламента — не проста пасведчанне. Што ён азначае, на ваш погляд?

— Ён азначае высокі грамадскі аўтарытэт і, я сказаў бы так, палітычную канкурэнтаздольнасць яго ўладальніка. Хто гэтай канкурэнтаздольнасці не меў, той сышоў з дыстанцыі яшчэ да завяршэння выбарчай кампаніі.

— Як вы ацэньваеце стартавыя пазіцыі Палаты прадстаўнікоў значна абноўленага персанальнага складу?

— Яны даволі перспектыўныя. Агульны патэнцыял дэпутатаў дастатковы, каб парламент працаваў на ўзроўні задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы. Дэпутаты «прынеслі» ў Авальную залу не толькі шчырае жаданне найлепшым чынам праявіць сябе на заканадаўчай ніве, але і багатыя веды, вопыт, інтэлект, што мы будзем максімальна выкарыстоўваць на карысць нашай агульнай справе.

— У парламента з'явіліся новыя заканадаўчыя магчымасці?

— Несумненна, з'явіліся. Папярэднімі скліканнямі Палаты прадстаўнікоў сфарміравана вялікая прававая база, па якой сёння жыве краіна, працуе эканоміка і сацыяльная сфера, умацоўваецца нацыянальная бяспека, усталёўваюцца і пашыраюцца міжнародныя сувязі. Але для далейшых эканамічных і грамадскіх пераўладкаванняў патрэбна ствараць законы новага пакалення. СТАР 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Старшыня ЦК КПРФ Генадзь ЗЮГАНАЎ:

«Санкцыі ЕС у адносінах да Беларусі неправамерныя і з'яўляюцца абсалютна кан'юнктурнымі. Гэта прамы націск на Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку за яго дружбу з Расіяй і незалежную ад Захаду палітыку. Адно незразумела: калі ЕС такі моцны прыхільнік «падтрымкі беларускага народа», то чаму ён вядзе разумны дыялог толькі з ліберальнай апазіцыяй, але па факце ігнаруе дзяржаўныя структуры і іншыя палітычныя сілы?»

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 2°
Віцебск	– 2°
Гомель	+ 2°
Гродна	+ 1°
Магілёў	– 3°
Мінск	– 1°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.10.2012 г.

Долар ЗША	8500,00	▼
Еўра	10970,00	▼
Рас. руб.	270,50	■
Укр. грыўня	1045,19	▲

ЗАЦВЕРДЖАНЫ БЮДЖЭТ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ

У нашай краіне зацверджаны новы бюджэт пражыткоўага мінімуму на адзін месяц у сярэднім на душу насельніцтва па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах. Перыяд дзеяння гэтага сацыяльнага нарматыву — з 1 лістапада 2012 года па 31 студзеня 2013 года.

Бюджэт пражыткоўага мінімуму штоквартальна зацвярджаецца ўрадам у цэнах апошняга месяца кожнага квартала (у нашым выпадку — у цэнах верасня гэтага года). Так, сёлета з 1 жніўня па 31 кастрычніка БПМ складае 843 870 рублёў. З лістапада ён будзе павышаны на 4,3% і складзе 880 030 рублёў.

Адпаведна, з лістапада на 4,3% узрастуць памеры дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, павялічацца памеры працоўных мінімальных і сацыяльных пенсій, а таксама надбаўкі і павышэнні, устаноўленыя да пенсій асобных катэгорый пенсіянераў.

Структура бюджэту пражыткоўага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў цэнах верасня гэтага года наступная: прадукты харчавання — 58%, плата за карыстанне жылым памяшканнем і камунальныя паслугі — 7,6%, прадметы гардэробу — 20,5%, тавары бытавога і гаспадарчага прызначэння — 4,6%, прадметы першай неабходнасці, санітарыі і лекі — 2,5%, бытавыя і транспартныя паслугі — 4,9%, узносы і плацяжы — 1,8%.

Святлана БУСЬКО.

Для працаздольнага насельніцтва БПМ складзе 963 130 рублёў, для пенсіянераў — 727 250 рублёў, для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — 749 950 рублёў, для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — 916 310 рублёў, для дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў — 994 850 рублёў, для дзяцей-студэнтаў — 884 100 рублёў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У РАДУ УКРАІНЫ ПРЫХОДЗЯЦЬ 5 ПАРТЫЙ

Ва Украіне пасля апрацоўкі больш за палову пратаколаў па выніках нядзельных парламенцкіх выбараў па партыйных спісах лідзіруе кіруючая Партыя рэгіёнаў. Яе адрыў ад апазіцыі памяншаецца, хоць застаецца даволі істотным. Ужо відавочна, што рэгіяналаў у новай Вярхоўнай Радзе падтрымаюць камуністы, якія ідуць на трэцім месцы. Іх ураўнаважыць «Бацькаўшчына» (другое месца) і партыя «УДАР» баксёра Віталя Клічко (чацвёртае). Грунтоўнае прадстаўніцтва атрымае ва ўкраінскім парламенце нацыяналістычная «Свабода», якой ужо даводзіцца адказваць на абвінавачванні ў антысемітызме. Неабходны бар'ер у 5% пераадолелі пяць партый. Вынік падліку 55,18% пратаколаў, паводле даных інтэрактыўнага табло ў прэс-цэнтры Цэнтрвыбаркама Украіны: 1. Партыя рэгіёнаў — 34,74% галасоў; 2. «Бацькаўшчына» — 22,16%; 3. Кампартыя — 14,83%; 4 «УДАР» — 12,88%; 5. «Свабода» — 8,51%.

У ЗША АДМЕНЕНЫ БОЛЬШ ЗА СЕМ ТЫСЯЧ АВІЯРЭЙСАЎ

Амерыканскія авіякампаніі адмянілі больш за 7100 рэйсаў, запланаваных на 28 і 29 кастрычніка, у сувязі з ураганам «Сэндзі». Авіякампаніі адмовіліся выплаціць кампенсацыі пасажырам. У сувязі з транспартнымі цяжкасцямі, а таксама эвакуацыяй жыхароў горада аказаліся перапоўненымі мясцовыя гасцініцы. Падобная сітуацыя назіралася ў жніўні 2011 года, калі было адменена каля 10 тысяч авіярэйсаў з-за ўрагану «Ірэн». З-за набліжэння ўрагану 26 кастрычніка ў штаце Нью-Ёрк было абвешчана надзвычайнае становішча. Па распараджэнні мэра горада з вечара 28 кастрычніка пачалася эвакуацыя жыхароў Нью-Ёрка з патэнцыйна небяспечных раёнаў, была прыпынена праца гарадскога транспарту. 29 кастрычніка не працавалі школы і дзяржустановы, за выключэннем надзвычайных ведамстваў, штаб-кватэра ААН, гарадскія паркі і бібліятэкі. Былі адключаны ліфты і водазабеспячэнне ў некаторых частках горада. Часткова прыпынілі працу Нью-Ёркская фондавая і таварная біржы. Раней ураган «Сэндзі», які зарадзіўся ў Карыбскім моры, прайшоў над Кубай, Ямайкай і Гаіці. Яго ахвярамі сталі больш за шэсцьдзясят чалавек.

КІНУЎШЫ КУРЫЦЬ, МОЖНА ЗАХАВАЦЬ ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ ЖЫЦЦЯ

Калі жанчына, якой яшчэ не споўнілася 30 гадоў, адмовіцца ад цыгарэт, ёй удасца зменшыць рызыкі заўчаснай смерці, упэўнены Оксфардскі ўніверсітэт. Апытанне 1,3 мільёна жанчын паказала: адмова ад курэння дазваляе пазбегнуць да 97% дадатковай рызыкі ранняй смерці. Так, жанчыны, якія курылі ўсё жыццё, паміралі на дзесяць гадоў раней за тых, хто не меў шкоднай звычкі. Але навукоўцы падкрэсліваюць: гэта зусім не азначае, што ў 20 гадоў можна выкурваць цыгарэты ў неабмежаванай колькасці — гэта ўсё роўна павысіць рызыку ранняй смерці.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЗА РЫСАЙ БЕДНАСЦІ ЗНАХОДЗЯЦЦА 5 МЛН БРЫТАНЦАЎ

Самая глыбокая рэцэсія ў пасляваеннай гісторыі Вялікабрытаніі прывяла да таго, што пяць мільёнаў брытанцаў (каля 20 адсоткаў усіх занятых) атрымліваюць зарплату ніжэй за мінімальна неабходную па сацыяльных стандартах.

Умоўная рыса беднасці ў гэтым даследаванні паказана як 8,3 фунта стэрлінгаў у гадзіну для Лондана і 7,3 фунта — для іншых населеных пунктаў Злучанага Каралеўства. Абавязковая мінімальная зарплата ў краіне складае 6,19 фунта для работнікаў, старэйшых за 21 год. Гэтыя лічбы не ўлічваюць падаткаабкладанне — у прыватнасці, падаходны падатак, які для маламаёмных брытанцаў звычайна складае 20 працэнтаў, а таксама ўзносы ў пенсійную сістэму. У найбольшай ступені ад рэцэсіі пацярпелі афіцыянты і бармены, супрацоўнікі службаў дастаўкі і прадаўцы. Нават нягледзячы на тое, што ў трэцім квартале Вялікабрытанія вярнулася да эканамічнага росту, большасць беднякоў заявіла ў апытанні, што ім сталі плаціць менш, чым у папярэднія месяцы.

38 адсоткаў рэспандэнтаў, якія атрымліваюць менш за пражыткоўы мінімум, сказалі, што з грашыма ў іх стала істотна горш, чым месяц таму. Самы вялікі працэнт тых, хто жыве на маленькую зарплату, аказаўся ў Паўночнай Ірландыі і Уэльсе (больш за 23 адсоткі). Увогуле большасць брытанскіх беднякоў пражывае ў Лондане і на паўночным захадзе Англіі — 570 тысяч чалавек.

НАДВОР'Е

ТЫДЗЕНЬ ЗІМЫ

Сёння ў многіх раёнах пройдзе снег, мокры снег, па паўднёвым усходзе — снег з дажджом, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У асобных раёнах ападкі сапраўды моцныя. Месцамі туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. У сераду на большай тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. Удзень па Брэсцкай вобласці снег з дажджом. У асобных мясцовасцях галалёд. Тэмпература ўначы на сераду — ад 0 да 5 марозу, пры праясненнях — да мінус 8 градусаў, удзень — ад мінус 3 па паўночным усходзе да плюс 5 па паўднёвым захадзе Беларусі. У першы дзень лістапада зноў чакаюцца невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі туман і галалёд. Уначы на чацвер чакаецца ад мінус 6 да плюс 1, а пры праясненнях прымарозіць да мінус 10 градусаў. А ўдзень тэмпературны фон пачне павялічвацца. Будзе ад мінус 1 да плюс 6, а на Брэстчыне — нават да плюс 8 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ЦІ СУСТРАКАЛІСЯ ВЫ Ў СВАІМ ЖЫЦЦІ З ДЗІЎНЫМІ, НА ВАШ ПОГЛЯД НЕЗРАЗУМЕЛЫМІ, АНАМАЛЬНЫМІ З'ЯВАМІ?

Уладзімір МАРТАЎ, урач анестэзіёлаг-рэаніматолаг Віцебскай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі:

— Я думаю, што ўсё, з чым я сутыкаўся ў жыцці, можа быць растлумачана. У гэтым сэнсе невытлумачальных або «анамальных» з'яў няма. У кожнай спачатку незвычайнай падзеі знаходзіліся прычыны, можа, нечакана глыбокага ўзроўню.

Напалеон неяк сказаў навукоўцам, якія яго суправаджалі, здаецца, на шляху ў Егіпет: «Няма цудаў. Усё — цуд!». Дарэчы, яму ж належыць яшчэ адна, на мой погляд, цікавая, «зорная» фраза. Уступаючы ў бой з праціўнікам, ён скамандаваў: «Навукоўцаў і аслоў — у сярэдзіну!» Меў на ўвазе сярэдзіну пяхотнага карэ, якое адбівае атаку варожай кавалерыі.

Уладзімір Сланімскі, пенсіянер:

— Было! У Санкт-Пецярбургу аднойчы бачыў невядомы лятаючы аб'ект. Я тады знаходзіўся ў самым цэнтры горада — ля галоўнага паштамта. Раптам прама над галавой убачыў нейкі аб'ект, які па форме быў вельмі падобны на цыгару, з ілюмінатарамі па перыметры. «Апарат» вісеў у нябёсах некалькі секундаў і знік з поля зроку раптоўна. Гэта адбылося гадоў трыццаць таму.

Сяргей ШАЛАГІН, мастацкі кіраўнік музычнага тэатра «Пецярбургская аперэта», заслужаны артыст Расіі:

— У мяне пяцёра дзяцей! Нічога больш цудоўнага, чым нараджэнне дзіцяці, у жыцці няма. Я праехаў увесь свет. І нічога, акрамя кахання і дзяцей, мяне не здзіўляла. Усё астатняе — не такое важнае, часовае. Калі табе тэлефануе тваё дзіця і кажа: «Тата, я цябе...» — што можа быць лепш? Я такі шчаслівы ад гэтага, у мяне слёзы ледзь не выступаюць... Кахайце, нараджайце... І здзіўляйцеся!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАДПІСАЎ ЗАКОН «АБ РЭСПУБЛІКАНСКІМ БЮДЖЭЦЕ НА 2013 ГОД»

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 26 кастрычніка падпісаў законы Рэспублікі Беларусь «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2013 год», «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь», «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2013 год» і «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Бюджэтны кодэкс Рэспублікі Беларусь».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫЗВАЛІЎ АД ЗАЙМАЕМЫХ ПАСАД АЛЕГА КАЧАНА І ІГАРА ЗАІЧКОВА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вызваліў ад займаемых пасад міністра спорту і турызму Алега Качана і памочніка Прэзідэнта па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму Ігара Заічкова.

На праведзеным 26 кастрычніка алімпійскім сходзе Нацыянальнага алімпійскага камітэта Прэзідэнт жорстка раскрытыкаваў работу па падрыхтоўцы спартсменаў да Гульняў у Лондане.

«Усе гэтыя няўдачы ў многім тлумачацца раз'яднанасцю і ўнутранымі разборкамі ў камандах. А такога быць не павінна, гэта Алімпіяда, і там не месца для высвятлення адносін», — упэўнены Прэзідэнт.

«Так, у нас ёсць шмат пытанняў да судзейства ў Лондане. Але ўсе спартыўныя чыноўнікі ведалі і павінны былі ўлічваць, куды мы едзем і як там адносяцца да спартсменаў высокага ўзроўню, якія гатовы адабраць медалі ў моцных гэтага свету, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Нельга забываць і аб тым грамадскім рэзанансе, які выклікалі спартыўныя няўдачы. На жаль, мінулыя Гульні сталі сапраўдным расчараваннем для ўсяго беларускага народа. Усе мы разлічвалі на больш важкія вынікі».

«Цяпер нам трэба ўлічыць усе недапрацоўкі, атрымаць урокі і эфектыўна вырашаць задачы, якія стаяць перад спартыўнай грамадскасцю. Не крыўдуйце, але з іншымі людзьмі ў кіраўніцтве», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«АБНОЎЛЕНЫ ПАРЛАМЕНТ НАСТРОЕНЫ НА ПРЫНЯЦЦЕ ЎЗВАЖАНЫХ І АДКАЗНЫХ ЗАКАНАДАЎЧЫХ РАШЭННЯЎ, ЯКІХ І ЧАКАЮЦЬ АД НАС ЛЮДЗІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наш прыярытэт — заканадаўчае забеспячэнне рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на гэтую пяцігодку. Дамінантныя тут пытанні мадэрнізацыі і стымулявання рэальнага сектара эканомікі. Прадметна і паслядоўна будзем займацца таксама развіццём заканадаўства па пытаннях сацыяльнай сферы, у тым ліку — аховы здароўя, адукацыі, навукі, культуры, сацыяльнай абароны, трымаючы ў фокусе асаблівай увагі тыя катэгорыі грамадзян, якія маюць пастаянную патрэбу ў дзяржаўнай дапамозе і падтрымцы. Выключна важную ролю адводзім пытанням бяспекі, аховы правапарадку, дзяржаўнага будаўніцтва, правоў чалавека, экалогіі, міжнародных адносін.

— Законы новага пакалення — гэта законы больш высокай якасці?

— Зразумела, так. І не толькі з боку так званай заканадаўчай тэхнікі. Але і ў сэнсе іх адэкватнасці задачам краіны, своечасовасці прыняцця, аптымальнасці прававых рашэнняў, іх уплыву на сацыяльнае самаадчуванне людзей.

— Спадзеяцеся на новыя ідэі ад дэпутатаў?

— Свежы погляд вельмі важны. Дэпутаты ж толькі што прыйшлі з вытворчасці, з розных устаноў і арганізацый, дзе займаліся канкрэтнымі пытаннямі, добра ведаюць рэгіянальныя праблемы і, зразумела, поўныя энтузіязму. Таму я небеспадстаўна лічу, што актыўная роля дэпутатаў будзе праяўляцца на ўсіх этапах заканатворчага працэсу — ад распрацоўкі законапраекта і прагназавання наступстваў яго прыняцця да вывучэння практыкі прымянення. Усе цікавыя, канструктыўныя ідэі будзем падтрымліваць. І не толькі дэпутацкія. Лічым неабходным пашырыць грамадскае абмеркаванне законапраектаў, выкарыстоўваючы раней напрацаваны парламентам пазітыўны вопыт і ўвогуле публічнасць дзейнасці Палаты прадстаўнікоў. Гэта датычыць і маніторынгу дзейных законаў дзеля вывучэння іх уздзеяння на грамадскія і эканамічныя адносіны ў дзяржаве і пры неабходнасці ўнясення адпаведных змяненняў і дапаўненняў.

— Што павінна быць галоўным, на вашу думку, у заканатворным дыялогу з грамадскасцю?

— Пошук шляхоў вырашэння канкрэтных праблем. Толькі такім чынам і можна зрабіць законы аптымальна канкрэтнымі.

— У дэпутатаў адзіная платформа поглядаў?

— Думаю, што па ключавых грамадска-палітычных задачах яна супадае.

— Ну, а калі па іншых пытаннях узнікнуць рознагалоссі?

— На тое і парламент, каб у ім бруілася думка, вяліся дыскусіі. Але якімі б гарачымі яны ні былі, завяршацца павінны не ўзвядзеннем «барыкад», а прыняццем узважаных, аптымальных рашэнняў. Я лічу прынцыпова важным, каб Палата прадстаўнікоў працавала канструктыўна.

— Ці мяркуеце што-небудзь мяняць ва ўзаемаадносінах з партнёрамі па заканатворчасці — Саветам Міністраў, Саветам Рэспублікі і Адміністрацыяй Прэзідэнта?

— Не трэба ламаць тое, што добра адпрацавана і прыносіць добры вынік. Традыцыю канструктыўнага супрацоўніцтва з іншымі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу мы будзем умацоўваць, удасканальваючы, разам з тым, па меры неабходнасці, заканатворчую тэхналогію.

— Адсутнасць канфрантацыі паміж заканадаўчай і выканаўчай галінамі ўлады апазіцыя трактуе як слабасць парламента.

— Такая трактоўка з'яўляецца следствам канцэпта разбурэння, якім запалонена свядомасць нашых апанентаў. Гэты канцэпт — скразная лінія ўсіх апазіцыйных СМІ і іх інтэрнэтаўскіх сайтаў. Разумеючы дэмакратыю як супрацьстаянне, сутычкі, яны не могуць прыняць нармальнай, стандартнай дэмакратычнай сітуацыі — згоды і зладжанасці паміж галінамі ўлады, заснаванай не на бяздумным «адабрамсе», а на сумеснай напружанай рабоце па пошуку ўзаемапрымальных, збалансаваных рашэнняў, на ўсведамленні агульнай адказнасці за стан спраў у грамадстве і дзяржаве. Хіба нацыянальная прававая сістэма магла б мець дзейную заканадаўчую базу, калі б Прэзідэнт і ўрад не абапіраліся на парламент, а парламент не меў падтрымкі з іх боку? Гэта ж элементарная, і не толькі палітычная, логіка! У радыкальных жа колаў яна такая: «Чым горш — тым лепш». Пра што яны і мараць. Але парламент будзе рабіць усё, што ад яго залежыць, каб гэтая мара нашых апанентаў не здзейснілася.

— Калі новавыбраныя дэпутаты ўнясуць у Палату прадстаўнікоў свае законапраекты, яны будуць прыняты?

— Пытанне аб прыняцці законапраекта вырашаецца ў парламенце ў вызначаным парадку і калектыўна — галасаваннем дэпутатаў у Авальнай зале. Асабістыя законапраекты тут не выключэнне. Яны таксама павінны прайсці працэдуру экспертызы і ўзгадненняў. Я, безумоўна, такую ініцыятыву вітаю, падтрымліваю, як гаворыцца, дзвюма рукамі і заклікаю калег уключацца ў заканатворчы працэс са сваімі ўласнымі законапраектамі і заканадаўчымі прапановамі. Разам з тым, перасцерагаю ад залішняй паспешлівасці, каб законапраект быў грунтоўна прапрацаваны і абавязкова запатрабаваны жыццём. Тады, зразумела, яго шанц на прыняцце будзе вялікі.

— Аператыўна сфарміраваўшы на першай сесіі рабочыя органы Палаты прадстаўнікоў, дэпутаты заняліся сваімі галоўнымі абавязкамі, сярод якіх, акрамя заканатворчасці, важнае месца займае і работа ў выбарчых акругах. Для большасці парламентарыяў гэта першыя сустрэчы з выбаршчыкамі ў новай якасці. Добры пачатак, як гаворыцца, — палова справы. А што, на ваш погляд, з'яўляецца асабліва важным, каб такім жа добрым быў і яе працяг?

— Трэба быць у курсе ўсіх кірункаў, задач і праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця раёнаў, якія ўваходзяць у выбарчую акругу, рэгулярна сустракацца з працоўнымі калектывамі, шчыра гутарыць з людзьмі пра тое, што іх клапоціць і хвалюе, аказваць магчымую дапамогу, трымаць на пастаянным кантролі вырашэнне сацыяльна важных пытанняў, інфармаваць людзей аб сутнасці новых законаў. Гэта, вядома, пункцірны абрыс дэпутацкай работы ў акрузе, яна шырэйшая і мае не толькі акружное значэнне, таму што самае істотнае трансліруецца на дзяржаўны ўзровень у заканадаўчых прапановах дэпутата, яго выступленнях у Авальнай зале і запытах у дзяржаўныя органы, ва ўрад. Я сказаў бы, што гэта адзін з інструментаў зваротнай сувязі, пашырэння рэгіянальнага складніка ў заканатворчым дыялогу Палаты прадстаўнікоў і ўплыву грамадскай думкі на выпрацоўку заканадаўчых і ўрадавых рашэнняў. Мы будзем актыўна выкарыстоўваць яго.

— Якія кірункі з'яўляюцца ключавымі для абноўленага парламента ў міжнароднай дзейнасці?

— Умацаванне дагаворна-прававой базы Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана, у будучым Еўразійскага эканамічнага саюза, супрацоўніцтва з Дзяржаўнай Думай Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі, з расійскімі парламентарыямі ў межах Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, а таксама з парламенцкімі структурамі постсавецкай прасторы. Будзем узаемадзейнічаць і з іншымі міжнароднымі арганізацыямі, з якімі ў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь склаліся сталыя адносіны, і па такіх новых вымярэннях, як Міжпарламенцкая асамблея АСЕАН, дзе беларускі парламент у верасні 2011 года атрымаў статус назіральніка. Прадоўжым міжпарламенцкія кантакты на двухбаковым узроўні. На першым плане для нас будуць пытанні гандлёва-эканамічных сувязяў, павелічэння беларускага экспарту, прыцягнення інвестыцый і ўмацавання іміджу краіны, на чым акцэнтаваў увагу парламентарыяў кіраўнік дзяржавы.

— Уладзімір Паўлавіч, дэпутаты ведаюць, чаго чакаюць людзі ад Палаты прадстаўнікоў?

— Калі б не ведалі, то не былі б выбраны дэпутатамі. Людзі чакаюць ад нас прыняцця ўзважаных, адказных заканадаўчых рашэнняў, якія стваралі б умовы для большай камфортнасці жыцця. Жыцця ў міры, бяспецы і дастатку. Такія рашэнні мы і будзем прымаць.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

■ Беларусы ў свеце

УЗАЕМАРАЗУМЕННЕ НА АДЛЕГЛАСЦІ

Яшчэ 20 гадоў таму беларусамі ў Расіі сябе лічыла амаль 1,5 млн чалавек. Па перапісе 2002 года — менш за 800 тысяч. Апошнім часам беларусамі сябе прызнаюць недзе паўмільёна жыхароў Расіі. Калі гэтая тэндэнцыя захаваецца, то праз 20 гадоў тых людзей, якія ідэнтыфікуюць сябе нашымі землякамі ў суседняй краіне, застанецца ў 6 разоў менш, чым у самым малым па плошчы суб'екце Расійскай Федэрацыі. Гэтая праблема не можа не хваляваць новага пасла Беларусі ў Расіі. Таму адна з першых нарад, якую Ігар ПЕТРЫШЭНКА правёў на новай пасадзе, — гэта нарада з прадстаўнікамі беларускіх дыяспар расійскіх рэгіёнаў.

«Наша душа ніколі не з'язджала з Беларусі»

У пасольства Беларусі ў Маскве з'ехаліся актывісты, у тым ліку і беларускамоўныя (!), больш чым з 30 расійскіх рэгіёнаў. І ўсе, як адзін, з такой цеплынёй гаварылі пра сваю малую радзіму!

Валерый Казакоў: «Я ганаруся, што ў Расіі ёсць людзі, якія робяць беларускую справу».

Але самае прыемнае, што словы гэтых людзей (як гэта нярэдка бывае) не разыходзяцца са справай. Менавіта па іх ініцыятыве асобныя вуліцы расійскіх гарадоў сёння носяць імёны знакамітых землякоў. У гонар апошніх узводзяцца помнікі, будуюцца цэрквы, ствараюцца музеі. Так, дзякуючы старшыні Праўлення Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў Новасібірску з'явілася царква імя святой Ефрасінні Полацкай. З падачы ганарова консула Беларусі ў Цюмені рэалізуецца шмат эканамічных праектаў з Беларуссю. Праз яго арганізацыю «Саюз інтэграцыі беларускіх народаў» заключаны пагадненні паміж 4 універсітэтамі Беларусі і Расіі. Узгадалі на нарадзе і піцерскага бізнэсмена, які аднавіў сваю родную вёску ў Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці. І не адзін (як аказваецца, не толькі дурны прыклад заразны) — яго ініцыятыву падтрымалі іншыя ўраджэнцы гэтай вёскі. І падобных канкрэтных прыкладаў, калі беларус, жывучы ў Расіі, гарыць беларускай справай, дастаткова.

Так, нельга абмінуць увагай **старшыню Савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі Валерыя КАЗАКОВА**, які на днях адзначыў 60-гадовы юбілей. Яго дзейнасць, накіраваная на прапаганду традыцый беларускай культуры, як гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (якое на нарадзе зачытаў пасол Беларусі), заслугоўвае самай высокай ацэнкі. «Дзякуючы ў тым ліку і Вашым намаганням нацыянальна-культурная аўтаномія ўзбагацілася новымі формамі работы, стала адыгрываць больш прыкметную ролю ў грамадскім жыцці Расіі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Упэўнены, што Вашы веды, жыццёвы вопыт, актыўная пазіцыя і ў далейшым будуць служыць умацаванню дружбы і ўзаемаразумення паміж нашымі брацкімі народамі».

Юбіляр жа, у сваю чаргу, падзяліўся з прысутнымі сваім болем. «Беларусы ў Расіі перастаюць сябе ідэнтыфікаваць як беларусы — нас, тых, чыя душа ніколі не з'язджала з Беларусі, за 20 гадоў стала амаль на 1 млн менш. Разам з тым, я ганаруся тым, што ў Расіі ёсць больш як 60 суполак, якія робяць беларускую справу. Гэта ўнікальныя людзі — беларуская соль рускай зямлі, якія сапраўды па-сапраўднаму ставяцца да выканання свайго духоўнага доўгу. Толькі за апошнія два гады яны правялі больш за 4,5 тыс. мерапрыемстваў у розных кутках Расіі. Нельга сёння застацца ў баку ад працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі. Прыйшоў час змяніць сваё ўтрыманскае стаўленне да нашай краіны — са слова «дай» на «вось мы прыйшлі і прынеслі нешта для Беларусі».

«Мы гатовы супрацоўнічаць з усімі, хто хоча працаваць у імя Беларусі»

Прынялі ўдзел у нарадзе і прадстаўнікі Мінкультуры і Мінадукацыі Беларусі. Яны выказалі гатоўнасць і далей падтрымліваць ініцыятывы суайчыннікаў за мяжой.

Старшыня Рады Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага Алег РУДАКОЎ папрасіў наладзіць курсы павышэння кваліфікацыі для іркуцкіх настаўнікаў беларускай мовы. **Галоўны інспектар упраўлення міжнародных сувязяў Міністэрства адукацыі Беларусі Герман АРТАМОНАЎ** пагадзіўся, што трэба падтрымліваць школы за межамі краіны, дзе вывучаюць беларускую мову. І прапанаваў Алегу Рудакову накіраваць ліст на адрас Мінадукацыі. «Хацелася б, каб актывісты грамадскіх арганізацый Расіі выходзілі на прамы кантакт з Міністэрствам адукацыі. Накіроўвайце нам свае прапановы, ініцыятывы ў пісьмовым выглядзе. І мы іх будзем разглядаць, прыкладаць намаганні, каб дапамагчы арганізаваць тое ці іншае мерапрыемства».

Падчас свайго звароту да прадстаўнікоў беларускіх дыяспар пасол Беларусі ў Расіі адзначыў, што «наладжана плённае супрацоўніцтва Тальяцінскай гарадской грамадскай арганізацыі «Нёман» і Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці. Актыўна ўзаемадзейнічаюць Пінск і Істрынскі раён Маскоўскай вобласці, Кобрынскі раён і Новасібірск, Віцебск і Самара, Гродна і Калінінград, Гомель і Сургут, Столін і Сергіеў Пасад. Пачаліся перамовы паміж Сыктыўкарам і Гомелем, Іркуцкам і Віцебскам. На жаль, у працэс усталявання і падтрымання партнёрскіх сувязяў уцягнуты далёка не ўсе арганізацыі суайчыннікаў, гэтай працы не хапае ініцыятыўнасці, больш творчага, арыентаванага на канкрэтныя вынікі падыходу. У сувязі з гэтым 16 лістапада ў Мінску адбудзецца VII сустрэча параднёных гарадоў Беларусі і Расіі».

Тэму, якую закрануў пасол, працягнуў **Міхаіл РЫБАКОЎ, дырэктар цэнтра нацыянальных культур Мінкультуры Беларусі**: «Праект развіцця партнёрства па формуле «адміністрацыйны раён Беларусі — грамадская арганізацыя беларусаў Расіі» быў агучаны ў пасольстве 10 гадоў таму на адной з падобных нарад. Як бачым, цяпер ён прыносіць дывідэнды. І сёння той, хто жадае, можа знайсці сабе партнёра ў Беларусі — адміністрацыйны раён, школу — і пачаць працаваць, абменьвацца калектывамі, дэлегацыямі, інфармацыяй, атрымліваць эканамічныя вынікі. Мы гатовы супрацоўнічаць з усімі, хто хоча працаваць на Беларусь, для Беларусі і ў імя Беларусі».

Беларускі культурны цэнтр адкрыецца ў 2014 годзе

Побач з будынкам пасольства Беларусі ў Маскве ўзводзіцца сучасны Беларускі культурна-інфармацыйны і навукова-тэхнічны цэнтр. Паводле слоў **саветніка-пасланніка пасольства Беларусі ў Расіі Алега ІВАНОВА**, яго адкрыццё запланавана на сярэдзіну 2014 года. Цэнтр будзе складацца з сямі паверхаў, тры з якіх — падземныя. У ім размесяцца кінаканцэртная зала на 280 месцаў, выставачнае памяшканне, зала для правядзення прэзентацый з сучасным абсталяваннем.

— Зараз мы думаем над канцэпцыяй культурнага цэнтра, ідэйным напаўненнем, каб ён быў функцыянальным і працаваў на інтэграцыю, — расказаў дыпламат. — Ёсць прапановы размясціць у ім бібліятэку беларускай літаратуры з рэдкімі выданнямі, арганізаваць заняткі нядзельнай школы, ладзіць адукацыйныя курсы, рэгулярныя выставы і выступленні вядомых дзеячаў айчыннай культуры і навукі. Але адназначна тут не будуць праводзіцца камерцыйныя мерапрыемствы, як гэта практыкуецца ў падобных цэнтрах іншых краін.

Алег Іваноў адзначыў, што будынак цэнтра будзе лічыцца тэрыторыяй пасольства. Аднак доступ у яго будзе вольным. «Грошы ўкладваюцца вельмі сур'ёзныя, бо будоўля ў цэнтры Масквы — вельмі нятаннае задавальненне, таму гэта не будзе выключна пасольскі цэнтр, ён павінен працаваць на ўсю рэспубліку», — падкрэсліў саветнік-пасланнік.

Не толькі песні і скокі

Эканоміка павінна стаць важным складнікам у дзейнасці беларускай дыяспары ў Расіі. Паводле слоў Алега Іванова, Беларусь чакае ад суайчыннікаў за мяжой не толькі далучэння да яе духоўных вытокаў, святыняў — яна чакае чагосьці канкрэтнага, рэальнага.

— Раней пытанні эканомікі ў дзейнасці дыяспары неяк сыходзілі ў цень. З аднаго боку, у нас не было дастаткова энергічных бізнэсменаў. З іншага — вельмі доўгі час беларусы пазіцыянавалі сябе і, як вынік, успрымаліся ў расійскім грамадстве, як бы гэта ні сумна гучала, на ўзроўні песень і скокаў у нацыянальных касцюмах. Цяпер сітуацыя мяняецца, чаму спрыяюць як пасольства, так і органы дзяржкіравання: у Беларусі існуе схема замацавання канкрэтных расійскіх рэгіёнаў за членамі ўрада. Калі раней асноўны ўпор рабіўся на нейкіх прамых сувязях, пастаўках, то цяпер для развіцця той жа дылерскай сеткі ў расійскіх рэгіёнах мы стараемся максімальна падключаць беларусаў.

Алег Іваноў дадаў, што ў эканамічнай дзейнасці дыяспары павінны дзейнічаць пэўныя прэферэнцыі. «Я зараз не буду казаць канкрэтна, гэтае пытанне ў прапрацоўцы, але льготы павінны быць, — адзначыў ён. — Усё-такі бізнэс рухаецца тады, калі яго чымсьці зацікавіць».

На маё пытанне, ці не з'явяцца ў бліжэйшай перспектыве Беларускія гандлёвыя дамы ў Расіі, накшталт Ерэванскага, дзе можна купіць практычна ўсё беларускае, Алег Іваноў толькі развёў рукамі:

— Рынак у Расіі даўно падзелены. Вольных ніш, якія можна было заняць гадоў 15 таму гандлёвымі дамамі, цяпер ужо няма. Нават па Маскве ў нас дастаткова вялікія цяжкасці па арганізацыі такога Беларускага вялікага гандлёвага дома. Магчыма, лепш рухацца кропкавымі элементамі, што мы і робім. У Маскве за апошні год з'явілася каля 2 дзясяткаў гандлёвых кропак, дзе прадаюцца беларускія тавары. Працуем мы і з дылерскімі цэнтрамі, якія былі створаны ў Расіі ў 1990-х гадах, спрабуем расшырыць там спектр паслуг, выйсці на прамысловую кааперацыю. З майго асабістага пункту гледжання, прамысловая кааперацыя ў шэрагу выпадкаў больш эфектыўная, чым стварэнне свайго гандлёвага дома, які арыентаваны толькі на продаж. Мы і на пасады ганаровых консулаў падбіраем людзей, гатовых займацца эканомікай, — падкрэсліў Алег Іваноў. — Не проста экспартам, а прасоўваннем беларускіх эканамічных інтарэсаў. Тых, якія гатовы займацца стварэннем сумесных вытворчасцяў, прамысловай кааперацыі.

Пасол Беларусі ў Расіі Ігар Петрышэнка (справа) і саветнік-пасланнік пасольства Алег Іваноў прымуць пад увагу ўсе прапановы прадстаўнікоў беларускіх дыяспар.

Па словах Алега Іванова, лік ганаровых консулаў Беларусі ў рэгіёнах Расіі павялічыцца ўдвая. «У нас доўгія гады на ўсю Расію было ўсяго тры ганаровыя консулы — у Маскве, Мурманску і Цюмені, — сказаў дыпламат. — А ў нашых суседзяў па СНД — малдаван, кіргізаў, армян — толькі ў Маскве па 3-5 ганаровых консулаў». У гэтым годзе ганаровы консул Беларусі з'явіўся ў Краснадары. У бліжэйшы час ганаровыя консулы будуць прызначаны ў Санкт-Пецярбургу і ў Югры».

❑❑❑

На нарадзе актывісты не толькі распавялі пра досвед працы Нацыянальна-культурных аўтаномій беларусаў у Расіі, але і ўнеслі шэраг прапаноў па пашырэнні супрацоўніцтва з пасольствам, органамі дзяржаўнай улады Беларусі. У прыватнасці, рэалізаваць праект па будаўніцтве беларуска-рускай вёскі, падумаць над стварэннем структуры пры пасольстве, куды можна звяртацца з прапановамі прадпрымальнікам з беларускімі каранямі. Правесці ў бліжэйшы час з'езд моладзі беларусаў Расіі ў Маскве, а чарговую нараду беларускіх дыяспар Расіі — на гістарычнай Радзіме, у Беларусі. **Мікалай УКРАІНЕЦ, кіраўнік Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі Таварыства беларускай культуры ва Удмурцкай Рэспубліцы «Бацькаўшчына»**, запрасіў аднадумцаў падключыцца да акцыі — сабраць грошы на рэканструкцыю Хатыні. Шчыра кажучы, радасна робіцца на душы, калі бачыш, што нават на адлегласці ў тысячы кіламетраў, людзі не проста настальгуюць па радзіме, але і робяць вызначаныя крокі, каб зрабіць яе лепшай. Гэтаму варта было б павучыцца і нам, тым беларусам, якія жывуць у Беларусі.

Надзея ДРЫЛА,
Мінск—Масква.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ПАДПОЛЬНАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ ВЫЯЎЛЕНА Ў ЛІДЗЕ

Супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі МУС Беларусі сумесна з калегамі з Лідскага райаддзела міліцыі перакрылі канал паставак сінтэтычных наркотыкаў у сталіцу, а таксама абясшкодзілі падпольную лабараторыю па вытворчасці смяротнага зелля.

У Мінску аператыўнікі пры падтрымцы байцоў спецпадраздзялення «Алмаз» затрымалі 27-гадовага непрацуючага лідчаніна, які спрабаваў рэалізаваць партыю амфетаміну. Потым па месцы яго жыхарства ў Лідзе сышчыкі выявілі падпольную лабараторыю з розным абсталяваннем, кіслатой, парашкамі, растваральнікамі і іншымі рэчывамі, якія, на думку аператыўнікаў, прымяняюцца для вытворчасці амфетаміну. Таксама знойдзена прыстасаванне для вырошчвання марыхуаны і здробненая сумесь, якая, верагодна, была прыгатавана для фасоўкі, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

УЗЯЛІ «МОДУ» — КАТАЦЦА НА ПАДНОЖКАХ ВАГОНАЎ

25 кастрычніка ў 16.35 15-гадовы навучэнец сталічнай гімназіі праехаў са станцыі метро «Пушкінская» ў напрамку станцыі «Моладзевая» на... падножцы апошняга вагона электрапоезда. Відэаролік такога зместу быў выкладзены праз два дні ў інтэрнэце: здымкі вёў равеснік «экстрэмала».

Як паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама, падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі крымінальнага вышуку УУС па ахове Мінскага метрапалітэна ўстанавілі асобу маладога чалавека. Ён, як і яго таварыш, раней не былі судзімыя, у поле зроку міліцыі не траплялі. У адносінах да падлетка складзены адміністрацыйны пратакол, матэрыялы праверкі накіраваны ў камісію па справах непаўналетніх Фрунзенскага раёна г. Мінска.

А 27 кастрычніка ў 16.20 супрацоўнікі УУС па ахове Мінскага метрапалітэна за аналагічны «подзвіг» затрымалі на платформе станцыі метро «Партызанская» 22-гадовага непрацуючага, раней судзімага за незаконны абарот наркотыкаў, мінчаніна. Будучы нападпітку, ён праехаў на падножцы паміж вагонамі ад станцыі «Першамайская» да месца затрымання. У адносінах да яго былі складзены адміністрацыйныя пратаколы: за знаходжанне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення і за парушэнне правілаў карыстання сродкамі чыгуначнага транспарту. Малады чалавек быў змешчаны ў цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў ГУУС Мінгарвыканкама. У панядзелак раніцай суд аштрафаваў яго на 2,2 мільёна рублёў.

ЦЭНЫ «ДАЮЦЬ ПРЫКУРЫЦЬ»

З 1 лістапада ў краіне зноў павялічваюцца рознічныя цэны на некаторыя маркі цыгарэт. Рост кошту складзе 1,9-13,1 працэнта. Падаражанне закране як асобныя тытунёвыя вырабы айчыннай вытворчасці (гродзенскай фабрыкі «Нёман» і «Тытунь-Інвест»), так і імпартныя цыгарэты.

Так, з названай даты максімальныя рознічныя цэны на тытунёвыя вырабы будуць павялічаны: на «Alliace» на 2,6 працэнта (да 3,9 тысячы рублёў за пачак), Pall Mall і Monte Carlo — на 12,9 працэнта (да 7 тысяч рублёў за пачак), Lucky Strike — на 5,9 працэнта (да 9 тысяч рублёў), Kent — на 5 працэнтаў (да 10,5 тысячы рублёў), Winston — на 5,7 працэнта (да 9,2 тысячы рублёў) і г.д. Сярод імпартных тытунёвых вырабаў, напрыклад, некалькі падаражэюць цыгарэты маркі «Aroma Rich» — на 5,3 працэнта (да 14 тысяч рублёў за пачак).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАНЦАЎ НЕ БЫЛО...

У нядзелю цягам пяці гадзін работнікі МНС тройчы выязджалі на ліквідацыю наступстваў дарожна-транспартных здарэнняў са смяротным зыходам. На вуліцы Каторава ў Наваполацку вадзіцель легкавога аўтамабіля «Сеат Таледа» на справіўся з кіраваннем, у выніку чаго аўто сутыкнулася з апорай моста. Загінулага давялося даставаць з машыны пры дапамозе аварыйна-выратавальнага абсталявання. Праз некалькі гадзін на трасе М-10 Кобрын — Гомель каля вёскі Таргошыцы ў Пінскім раёне сутыкнуліся легкавік «Мерседэс А-140» і грузавік «Вольва». Кіроўца і пасажыр легкавога аўтамабіля загінулі. Гібеллю кіроўцы легкавіка «Пежо 406» і яго пасажыркі скончылася сутыкненне гэтай машыны з «МАЗам». Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ў 13 гадзін каля вёскі Вішнёўка Бабруйскага раёна. Кіроўцу грузавіка шпіталізавалі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАВОЧНАЯ ПРАМАЯ ЛІНІЯ

ЛЕЧЫМ ВОЧКІ

У Медыцынскім цэнтры — МТЗ гэтай восенню з'явілася найноўшае абсталяванне — эксімерны лазер для выпраўлення анамаліі рэфракцыі, што яшчэ больш пашырае магчымасці аказання афтальмалагічнай нетраўматычнай дапамогі ў нашай краіне. Любыя пытанні адносна прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння афтальмалагічнай паталогіі адрасуйце загадчыку аддзела афтальмалагічнай дапамогі Медыцынскага цэнтра — МТЗ, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, доктару медыцынскіх навук, прафесару Мікалаю Іванавічу ПАЗНЯКУ на працягу бліжэйшага тыдня, да 1 лістапада, па нумары 8 (017) 287 18 29 (Святлане Барысенка). Усе адказы на пытанні будуць надрукаваны ў «Звяздзе».

9 ноября 2012 года в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров

ОАО «ЭнКоСтрой»

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Увеличение уставного фонда (до величины чистых активов).
2. Об органах управления.
3. Утверждение Устава в новой редакции.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.

Начало регистрации в 11.30.

УНП 191303197

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ УНП 190017558

открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО»

(г. Минск, проспект Партизанский, 8)

СОСТОИТСЯ 5 ноября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8 В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

Орган, по решению которого созывается общее собрание акционеров: Наблюдательный совет ОАО «МОТОВЕЛО».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении результатов закрытой подписки на простые (обыкновенные) акции ОАО «МОТОВЕЛО».
2. Об утверждении решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО».
3. Об утверждении изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО».
4. Об утверждении цены выкупа простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО» по требованию акционеров.

Бюллетени для заочного голосования акционеры получают с 1 ноября по 2 ноября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00), под роспись при предъявлении паспорта (для представителей акционеров — паспорта и доверенности).

Акционеры обязаны возвратить заполненные бюллетени для заочного голосования по указанному адресу не позднее 17.00 2 ноября 2012 г.

С проектом решений собрания, решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО», изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО», формой и текстом бюллетеня для заочного голосования акционеры могут ознакомиться с 1 ноября по 2 ноября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00).

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «МОТОВЕЛО» по состоянию на 29 октября 2012 г.

Выкуп акций по требованию акционеров производится по номинальной стоимости. Заявления от акционеров о выкупе акций по требованию акционеров принимаются 5 ноября 2012 г.

Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 0800712, 0800731, 0706967, 0706968, 0706993, 0710324, 0871527, 0871528, 0871531, 0871533--0871535, 0953264, 1009401, 1009403, 0881388, 0795917, 0886365, 0886367, 0886374, 1075811
- квитанции 1 СУ серия КС № 3473464

УНП 100782388

■ Дэмаграфія

ЧАГО ЧАКАЦЬ АД УВЯДЗЕННЯ МАЦЯРЫНСКАГА КАПІТАЛУ?

Як зрабіць так, каб нашы жанчыны захацелі нараджаць, і не проста адно дзіця, але і дваіх-траіх і больш? Можа, паспрабаваць максімальна аблегчыць ім жыццё? У Беларусі абмяркоўваюць новую форму сацыяльнай падтрымкі сем'яў — увядзенне мацярынскага капіталу. Менавіта гэтаму пытанню быў прысвечаны экспертна-медыйны семінар у Мінску «Фарміраванне і рэалізацыя механізму сямейнага (матчынага) капіталу ў сістэме мер эканамічнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі ў дзяржавах — удзельніцах Саюзнай дзяржавы». Семінар быў арганізаваны Міністэрствам працы і сацабароны Беларусі пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

— Тэма мацярынскага капіталу нам блізкая, але мы да яе толькі падступаем. Напярэдзе сур'ёзная праца. Неабходна ўзважыць усе «за» і «супраць», перш чым прымаць рашэнне, — заявіў **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр ГРУШНІК.** — Тым больш што ўвядзенне гэтага механізму цягне значныя фінансавыя затраты. І трэба суаднесці іх з тым дэмаграфічным эфектам, да якога можа прывесці новая форма сацыяльнай падтрымкі сем'яў». Цяпер нашы спецыялісты вывучаюць вопыт расійскага боку, аналізуюць рэалізацыю такой праграмы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Расійскай Федэрацыі Алена СТРАХАВА.

МАЦЯРЫНСКІ КАПІТАЛ: ШТО ВЫ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ

Мацярынскі капітал з'яўляецца адной з формаў падтрымкі маладых сем'яў. Гаворка ідзе аб дастаткова буйных сумах грошай, якія выдзяляе дзяржава. Гэтыя грошы дзяржава перадае ў Пенсійны фонд, а ўжо там вядзецца работа з маці і выдаткоўваюцца неабходныя сродкі кожнай жанчыне, якая падыходзіць пад вызначаныя законам умовы.

Рашэнне аб запуску гэтай праграмы ў Расіі з'явілася пасля таго, як былі прааналізаваны смяротнасць і нараджальнасць на яе тэрыторыі, у выніку чаго ўрад прыйшоў да высновы, што калі ў бліжэйшыя гады сітуацыя з нараджальнасцю і прыростам насельніцтва не зменіцца, то краіну чакае дэмаграфічная катастрофа.

У выніку было прынята рашэнне стварыць спрыяльныя ўмовы для сем'яў, у якіх асмеліліся завесці другога і наступных дзяцей, у выглядзе грашовай дапамогі, якую можна накіраваць на самыя надзённыя сямейныя праблемы. Бо галоўная задача гэтай праграмы — стымуляваць нараджэнне другога дзіцяці.

— Калі ў 2007 годзе праграма была запушчана, памер мацярынскага капіталу складаў 250 000 рублёў. Пры ўстанаўленні памеру зыходзілі з кошту аднаго пакоя (г.зн. на гэтыя грошы можна набыць яшчэ адзін пакой, каб не было пагаршэння жыллёвых умоў сям'і). Законам прадугледжана штогадовае павышэнне гэтай сумы, што звязана з інфляцыяй, — распавяла **намеснік дырэктара Дэпартамента дэмаграфічнай палітыкі і сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны** колькасці жанчын актыўнага рэпрадуктыўнага ўзросту, але і прынятыя дзяржавай меры па стымуляванні нараджальнасці.

Так, у 2005 годзе быў уведзены дыферэнцыраваны падыход да вызначэння велічыні дапамогі пры нараджэнні дзіцяці ў залежнасці ад чарговасці нараджэння. Павялічыўся і памер дапамогі ў сувязі з нараджэннем трэцяга і наступных дзяцей (з 2 да 3 БПМ — бюджэтаў пражыткавага мінімуму). У 2007 годзе былі ўстаноўлены павышаныя памеры аднаразовай дапамогі пры нараджэнні дзяцей: 5 БПМ — пры нараджэнні першага дзіцяці і 7 БПМ — пры нараджэнні другога і наступных дзяцей. З 2005 года таксама ўступіў у сілу шэраг нарматыўна-прававых актаў па вырашэнні жыллёвых праблем шматдзетных сем'яў, выдзяленні ім ільготных крэдытаў пры будаўніцтве жылля, аказанні фінансавай дапамогі ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах. Уплыў гэтых фактараў асабліва прыкметным быў у 2006-2009 гадах. Аднак, нягледзячы на гэта, значэнне сумарнага каэфіцыента нараджальнасці ў нашай краіне застаецца ніжэй за сярэдні ўзровень па краінах Еўропы.

Як заяўляе **міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяна ШЧОТКІНА,** сёння ў Беларусі існуе адна з найбольш стабільных сярод краін СНД сістэм гарантый і льгот для сем'яў з дзецьмі. Да прыкладу, бацькам, якія выхоўваюць чацвярых і больш дзяцей, дзяржава пагашае адпаведна 75 ці 100% кошту жыллёвага крэдыту. Тым не менш, спецыялісты прагназуюць, што, нягледзячы на ўсе меры па стымуляванні нараджальнасці і шэраг станоўчых тэндэнцый, дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі ў хуткай будучыні пагражае ўскладніцца.

Ужо ў 2010 годзе адзначана зніжэнне колькасці народжаных дзяцей, якое, па прагнозах, будзе працягвацца да 2030 года. Зніжэнне колькасці народжаных таксама чакаецца з 2040 года. Прагназуемыя спады і ўздымы абумоўлены тым, што паступова памяншаецца лік патэнцыйных маці. Бо гэта — следства зніжэння колькасці нараджэнняў жанчын папярэдняга пакалення. Таму дзяржаве вельмі важна з дапамогай мер дэмаграфічнай палітыкі паспрабаваць знізіць глыбіню спаду нараджальнасці, які прагназуецца.

Нацыянальнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гады прадугледжваецца ў 2013 годзе ўнясенне прапаноў аб мэтазгоднасці дадатковай сацыяльна-эканамічнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, у тым ліку ўвядзенне «сямейнага капіталу». Хоць, як справядліва падкрэсліваюць спецыялісты, самым аптымальным з'яўляецца такі падыход да вырашэння дэмаграфічных праблем, які ўключае ў сябе цэлы комплекс мер па падтрымцы сям'і.

Святлана БУСЬКО

ДЭМАГРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ ПАГРАЖАЕ ЎСКЛАДНІЦЦА

У нашай краіне скарачэнне колькасці насельніцтва назіраецца з 1993 года, калі смяротнасць упершыню перавысіла нараджальнасць. Першыя станоўчыя змены ў дынаміцы нараджальнасці намеціліся з 2004 года. Гэтаму спрыяла не толькі павышэнне

■ У суседзяў

У ЛІТВЕ ПАРТЫЮ ПРАЦЫ І ЯЕ КІРАЎНІКОЎ АБВІНАВАЦІЛІ Ў МАХЛЯРСТВЕ

Мінулая пятніца (26 кастрычніка) пачалася даволі спакойна, хоць гэта быў апошні працоўны дзень перад другім турам выбараў у Сейм Літвы. У нядзелю выбаршчыкі павінны былі вырашыць, каму з 134 кандыдатаў адчыніць дзверы ў Сейм. 14 кастрычніка, у першым туры выбараў, па шматмандатных акругах больш за ўсё галасоў атрымала апазіцыйная Партыя працы (ПП). За яе прагаласавала 19,84% выбаршчыкаў. Па спісе ПП 17 яе членаў былі выбраны ў Сейм Літвы. Добрых вынікаў ПП спадзявалася дасягнуць і ў другім туры выбараў. На 70 мандатаў у Сейм прэтэндавала ўжо 35 кандыдатаў ПП. Лідар ПП Віктар Успаскіх на тэлебачанні нават загаварыў пра партфель прэм'ера Літвы.

Але ў пятніцу днём грымнуў гром. Не з неба, а з Генеральнай пракуратуры Літвы. Яна прад'явіла абвінавачванні ў махлярстве па справе аб «чорнай бухгалтэрыі» Партыі працы яе лідару, члену Еўрапарламента Віктару Успаскіх, дэпутату Сейма Вітаўтасу Гапшысу, кандыдату ў дэпутаты Сейма Віталіі Ванжутайтэ і былому фінансісту партыі Марыне Люткявічэне.

Такое абвінавачванне з'явілася пасля таго, як пракурор Саўлюс Вярсяцкас перакваліфікаваў дзеянні абвінавачаных. Раней ПП і чацвёра звязаных з ёй людзей абвінавачваліся ў дачы недакладных звестак аб даходах, прыбытку і маёмасці з мэтай утойвання падаткаў і ў ілжывай заяве аб дзейнасці юрыдычнай асобы. Абодва гэтыя абвінавачванні перакваліфікаваны ў абвінавачванні ў адпаведнасці з 2 часткай 182 артыкула Крымінальнага кодэкса, якая прадугледжвае адказнасць за махлярства.

«З улікам цяперашняй судовай практыкі ў такога роду справах, утойванне падаткаў ад дзяржавы — гэта махлярства», — сказаў пракурор С. Вярсяцкас, адказваючы на пытанне, чаму перакваліфікаваны абвінавачванні ў справе ПП. На яго думку, фактычныя абставіны справы не мяняюцца, толькі даецца іншая юрыдычная ацэнка.

Паводле слоў пракурора, пасля таго, як абвінавачванні мяняюць на больш цяжкія, падаўжаецца і тэрмін даўнасці, узмацняецца і адказнасць. Па ранейшых абвінавачваннях тэрмін даўнасці быў 8 гадоў (з 2006), цяпер — 10 гадоў. Удакладненыя абвінавачванні былі прад'яўлены ўдзельнікам працэсу.

Лідар Партыі працы, член Еўрапарламента Віктар Успаскіх адхіляе абвінавачванні ў махлярстве.

Партыя працы неадкладна адрэагавала. В. Успаскіх адразу заявіў, што запатрабуе ў судзе адхіліць ад разгляду справы аб «чорнай бухгалтэрыі» ПП пракурора Саўлюса Вярсяцкаса.

«Палітыканства. Няма ніякіх акалічнасцяў, каб мяняць абвінавачванні перад выбарамі. Гэта адназначнае палітыканства. Мы будзем патрабаваць адхілення пракурора», — у пятніцу сказаў журналістам В. Успаскіх, адказваючы на пытанне аб ацэнцы перакваліфікацыі абвінавачванняў.

Іншы абвінавачаны па справе, віцэ-старшыня Партыі працы і дэпутат Сейма Літвы Вітаўтас Гапшыс назваў дзеянні пракурора палітычнай акцыяй.

«Інакш як палітычную акцыю я гэта расцаніць не магу, бо гэта зроблена напярэдадні другога тура парламенцкіх выбараў, калі да галасавання засталіся лічаныя гадзіны», — сказаў В. Гапшыс.

«Сам пракурор прызнаў, што нічога не змянілася ў параўнанні з тым, што ён бачыў у 2006—2007 гадах, змянілася толькі палітычная сітуацыя», — абураўся В. Гапшыс. Ён сцвярджаў, што суд пакуль яшчэ толькі прыняў заяву пракурора, аднак паведамленне ў сувязі з гэтым не рабіў, вырашыў зрабіць перапынак, каб з заявай маглі азнаёміцца абвінавачаныя.

«Пракурор цудоўна разумеў, што лепш за ўсё такую заяву падаць у апошні дзень перад другім турам выбараў, калі яе немагчыма аспрэчыць. Нават калі пасля гэтага суд і не задаволіць просьбу пракурора, выбары ўжо скончацца», — сказаў В. Гапшыс.

Ствараецца ўражанне, што партыя кансерватараў, якая была дагэтуль пры ўладзе, не хоча мірыцца з паражэннем на першым туры выбараў у Сейм.

Пішу гэты артыкул у суботу, па гарачых слядах. Заўтра пайду галасаваць. Ці паўплываюць дзеянні пракуратуры на вынікі выбараў? Наўрад ці. Праз некалькі дзён мы атрымаем адказ.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС, уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве. Фота аўтара.

Вільнюс.

P.S. У нядзелю а 20 гадзіне завяршыліся выбары ў Сейм (парламент) Літвы. Выбаршчыкі выказалі сваю волю адносна таго, каго хочуць бачыць у новым парламенце. У другім туры галасавалі выбаршчыкі аднамандатных акруг. Удзельнічалі кандыдаты, якія набралі ў першым туры (14 кастрычніка) больш за ўсё галасоў.

Ужо ўначы стала вядома, што пацвердзіліся прагнозы многіх палітолагаў: улада ў Літве крута зменіцца. Партыя правага толку кансерватараў, якая была ва ўладзе, сыходзіць у апазіцыю. А левага толку Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (ЛСДП), якая знаходзілася ў апазіцыі, у новым парламенце будзе мець самую шматлікую фракцыю.

У шматмандатнай акрузе ЛСДП атрымала 15 мандатаў, а старшыня партыі Альгірдас Буткявічус быў выбраны ў Сейм ужо ў першым туры. Паводле папярэдніх звестак, ЛСДП пасля двух тураў атрымала 39 мандатаў у новым парламенце. Гэта больш, чым ва ўсіх іншых партый, але не хапае для большасці ў Сейме.

Сацыял-дэмакраты гэта прадбачылі і адразу пасля першага тура галасавання стварылі кааліцыю з дзвюма партыямі, якія былі ў апазіцыі, — Партыяй працы (ПП) і партыяй «Парадак і справядлівасць».

Партыя працы, нягледзячы на рашэнне Генеральнай пракуратуры, якая абвінаваціла яе лідараў у махлярстве, добра паказала сябе на выбарах, атрымаўшы 29 мандатаў у новым Сейме. Апазіцыйная партыя «Парадак і справядлівасць» будзе мець у Сейме 11 сваіх парламентарыяў. Усяго новая кіруючая кааліцыя ў Сейме будзе прадстаўлена 79 парламентарыямі, калі для большасці хапае 71 голаса.

Пасля таго, як сталі вядомыя вынікі галасавання ў другім туры парламенцкіх выбараў, лідар сацыял-дэмакратаў Альгірдас Буткявічус, старшыня Партыі працы Віктар Успаскіх і кіраўнік «Парадку і справядлівасці» Раландас Паксас сустрэліся ў гасцініцы «Новы Вільнюс». Палітыкі дамовіліся, што прэм'ерам стане прадстаўнік сацыял-дэмакратаў, хутчэй за ўсё, — А. Буткявічус, а старшыня Партыі працы Віктар Успаскіх пакуль толькі сказаў, што будзе членам кабінета міністраў, але не канкрэтызаваў, які пост ён хацеў бы заняць.

«Мы дамовіліся, што прэм'ер-міністрам будзе прадстаўнік Сацыял-дэмакратычнай партыі і што пачнём рыхтаваць новую ўрадавую праграму, будуць створаны працоўныя групы з прадстаўнікоў цяперашніх трох партый, на наступным тыдні пераглядзім праект дзяржбюджэту», — пасля сустрэчы сказаў А. Буткявічус.

На пытанне аб размеркаванні пасад у будучым урадзе кіраўнік сацыял-дэмакратаў сказаў, што гэта пакуль не абмяркоўвалася. Паводле неафіцыйных звестак, сацыял-дэмакраты будуць прэтэндаваць на партфелі міністраў фінансаў і замежных спраў. Дарэчы, кандыдатам на пост міністра замежных спраў згадваецца і цяперашні пасол Літвы ў Беларусі Лінас Лінкевічус

■ Погляд

АДМОВА АД «КАСЫГІНСКАЙ» РЭФОРМЫ ПРЫВЯЛА ДА РАСПАДУ СССР?

Аб выніках рэалізацыі слыннай гаспадарчай рэформы ў СССР у 1965—1970 гг. і прычынах яе згортвання наш карэспандэнт гутарыць з вядомым эканамістам, доктарам навук, прафесарам, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пятром НІКІЦЕНКАМ.

НАША ДАВЕДКА

«Касыгінская» рэформа прамысловасці была накіравана на ўзмацненне эканамічнага стымулявання і пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў. Старшыня Савета Міністраў СССР Аляксей Касыгін хацеў рэфармаваць прадпрыемствы з мэтай павысіць іх эфектыўнасць. У той жа час адначасова ўзмацнялася вертыкаль улады, аднаўляліся цэнтральныя прамысловыя міністэрствы замест саветаў народнай гаспадаркі. У цэлым па краіне па ўсіх галоўных сацыяльна-эканамічных паказчыках перыяд 1965—1970-х гг. быў лепшым за ўсе гады савецкай улады.

— Недарэмна кажуць, што ўсё новае — гэта добра забытае старое. Сёння нярэдка ад сталых эканамістаў, гаспадарнікаў-практыкаў можна пачуць пахвальныя словы наконт «касыгінскай» рэформы СССР 1965—1970 гадоў. Чым яна была вядомая і асаблівая?

— Ды па многіх параметрах. Яна прывяла да істотнага эканамічнага росту СССР і павышэння яго аўтарытэту ў свеце як звышдзяржавы. Што датычыць БССР, то яна ў выніку рэалізацыі рэформы дасягнула свайго найвышэйшага ўзроўню ў сацыяльна-эканамічным развіцці. Упершыню за ўсю гісторыю знаходжання Беларусі ў СССР гэта была сістэмная эканамічная рэформа, якая садзейнічала развіццю прадукцыйных сіл і сацыяліс-тычных вытворчых адносін, павышэнню эфектыўнасці выкарыстання прыродных і чалавечых рэсурсаў, усяго назапашанага матэрыяльнага і нематэрыяльнага багацця. Гэта дазволіла забяспечыць больш дынамічны і эфектыўны эканамічны рост нашай рэспублікі.

У выніку такога механізму гаспадарання Беларусь ператварылася ў вядучы інавацыйны канкурэнтаздольны навукова-адукацыйны і навукова-вытворчы цэнтр СССР. Той перыяд увайшоў у айчынную эканамічную гісторыю і свядомасць белаграсаў як «машэраўскі». Ён працягваўся да 1980 года. Нагадаю, Пётр Міронавіч Машэраў тады кіраваў нашай рэспублікай, асабіста шмат зрабіў для яе росквіту ў розных сферах.

— Намаганні тагачасных рэфарматараў былі накіраваны на ліквідацыю шматлікіх валюнтарысцкіх перакосаў, скрыўленняў, перагібаў і эканамічных фантазій Мікіты Хрушчова. Ці інакш кажучы, адбылося ўдалае рэфармаванне планавай эканомікі. А мы ўжо не першы год рухаемся па рынкавым шляху, у меру сваіх магчымасцяў стараемся трансфарміраваць дзяржаўную ўласнасць, паступова пашыраем прысутнасць прыватнага сектара ў эканоміцы. Можа, нам і не патрэбны той досвед?

— Гэта як паглядзець. Сапраўды, сёння з эканамічнага аналізу і практыкі гаспадарання касыгінскія падыходы выключаны. Шматлікія рэфарматары, эканамісты-аналітыкі іх проста не ведаюць і не разумеюць. Шкада. Ім не пашкодзіла б уважліва прыглядзецца да таго, як удала гаспадарылі адносна нядаўна на прасторах СССР. Нагадаю сёе-тое з былой практыкі. Праца калектываў ацэньвалася і стымулявалася праз такія метады і паказчыкі эканамічнай эфектыўнасці, як гаспадарчы разлік, прыбытак і прыбытак ад рэалізаванай прадукцыі, фондаадда-ча, фондаёмістасць, абарачальнасць абаротных сродкаў, энергаёмістасць, фондавая ўзброенасць і прадукцыйнасць працы, працаёмкасць, інтэнсіфікацыя, навукова-тэхнічны прагрэс, каэфіцыент выкарыстання вытворчых магутнасцяў, рэнтабельнасць і інш. Усе прамыслоўцы, эканамісты краіны, у тым ліку і кіраўнікі, глыбока ведалі і разумелі сутнасць і ўзаемасувязь гэтых метадаў і паказчыкаў. І цяпер, у сувязі з пачаткам мадэрнізацыі паўстала неабходнасць выкарыстання назапашанага ўласнага практычнага досведу гаспадарання ў Беларусі ў 1965—1980 гадах.

— А што яшчэ важна, на ваш погляд, з забытых формаў і метадаў гаспадарання?

— Напрыклад, тое, што грашова-крэдытная сістэма СССР забяспечвалася «звязанай» эмісіяй савецкага рубля з нацыянальным багаццем і працай. Уласных грошай у СССР і Беларусі было заўсёды досыць для аплаты працы людзям, занятых ва ўсіх сферах матэрыяльнай і нематэрыяльнай вытворчасці тавараў, работ і паслуг. Замежныя грошы, тыя ж долары, выкарыстоўваліся толькі пры разліках у знешнеэканамічнай дзейнасці, не было вялікіх валютных даўгоў.

— І ўсё ж, што канкрэтна дала Беларускай ССР і яе народу «касыгінская» рэформа і яе працяг?

— Тут не абысціся без лічбаў. За 15 гадоў (1965—1980 гг.) развіцця Беларусь павялічыла свой валавы і грамадскі прадукт больш чым утрая супраць 2,4 раза ў сярэднім у СССР. Рост нацыянальнага даходу таксама меў станоўчую дынаміку. Асабліва хуткімі тэмпамі рухалася наперад вытворчасць сродкаў вытворчасці (група «А»). Калі ў СССР гэтая група павялічылася ў сярэднім у 2,8 раза, то ў Беларусі яе рост склаў амаль 4,7 раза. Апераджальнымі тэмпамі вялася вытворчасць тавараў шырокага спажывання (група «Б»). Яе рост у Беларусі склаў амаль 3,5 раза супраць 2,5 раза ўвогуле па Саюзе.

Але самае галоўнае — беларускага народа стала больш. Без усялякай агітацыі і разважанняў аб дэмаграфічнай бяспецы, без значных цяперашніх матэрыяльных прэферэнцый маладым сем'ям адбыўся натуральны прырост насельніцтва: у 1980 годзе ў БССР пражывала 9,6 млн чалавек. Потым гэты паказчык перабольшыў 10-мільённы рубеж.

У Беларусі за гэтыя 15 гадоў удалося забяспечыць рост якасці чалавечага патэнцыялу, што з'яўляецца галоўнай прадукцыйнай сілай любой дзяржавы. Колькасць спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, занятых у народнай гаспадарцы, павялічылася да 1980 года ў параўнанні з 1965 годам у 2,7 раза, а ў СССР — у 2,4 раза. Уся навука (фундаментальная, галіновая, ВНУ) дасягнула свайго найвышэйшага росквіту, матэрыяльнага і маральнага прэстыжу ў грамадстве. Гэтыя ўсе здабыткі былі абумоўлены рэалізацыяй гаспадарчай рэформы.

— Дык чаму яна была паступова згорнута і чым гэта нам усім з часам адгукнулася?

— Нежаданнем і няўменнем брэжнеўскай каманды, асабліва кансерватыўнай часткі Палітбюро ЦК КПСС, эфектыўна кіраваць эканомікай вялікай дзяржавы. Рэформа, як потым высветлілася, правадзілася непаслядоўна, тармазілася мясцовымі ўладамі. Пашырэнне самастойнасці спалучалася з узмацненнем адміністрацыйных і эканамічных паўнамоцтваў міністэрстваў. Кіраўнікі партыі адчулі пагрозу сваёй абсалютнай улады. Рэфармаванне было згорнута, яе канчатковыя мэты рэформы не былі дасягнуты.

Касыгіну прыпісваюцца словы: «Нічога не засталося. Усё павалілася. Усе работы спынены, а рэформы трапілі ў рукі людзей, якія іх наогул не жадаюць... Рэформу тарпедуюць. Людзей, з якімі я распрацоўваў матэрыялы з'езда, ужо адхілілі, а заклікалі зусім іншых. І я ўжо нічога не чакаю».

Акрамя гэтага, рост паступленняў ад экспарту энерганосьбітаў, даваў магчымасць кансерватарам у савецкім кіраўніцтве падтрымліваць эканамічны рост і задавальняць унутраны спажывецкі попыт за кошт хуткага павелічэння імпарту. Паступова назапашваліся і не вырашаліся праблемы, яны замоўчваліся, лакіраваліся. Пачаўся сумна вядомы «застой», узрушэнні ў нацыянальных рэспубліках, узаемныя прэтэнзіі. Усё скончылася так званым «парадам суверэнітэтаў».

Набліжэнне катастрофы адчуваў і Машэраў. Памятаю, на адной сустрэчы ў вузкім коле Пётр Міронавіч сказаў, што мы ідзём ад дрэннага да горшага. Як у ваду глядзеў. Вось і дайшлі ў пачатку 1990-х гадоў. Маё глыбокае перакананне: адмова ад «касыгінскай» рэформы прывяла ў рэшце рэшт да развалу СССР.

— Чым можа быць карысным досвед тагачасных «касыгінскіх» рэфарматараў для цяперашняй Беларусі, якая знаходзіцца ў прынцыпова новых умовах гаспадарання? Скажам, тады фінансавай базай рэфармавання быў моцны і ўстойлівы савецкі рубель, які амаль што на роўных спаборнічаў з амерыканскім доларам. Зараз наш рубель падвяргаецца з усіх бакоў ціску. Як вам з гэтай нагоды здаюцца прапановы ўвесці ў краінах Мытнага саюза адзіную валюту?

— Калі казаць наконт касыгінскага досведу, то я параіў бы звярнуць увагу на яго фондаэканомны механізм гаспадарання. Ён можа стаць асновай павышэння канкурэнтаздольнасці і ўстойлівага інавацыйнага развіцця Беларусі ў сусветнай супольнасці. Ці варта ўводзіць адзіную валюту? Агульная грашовая сістэма надала б дынаміку эканамічным працэсам у межах Мытнага саюза. Я думаю, што Беларусь ад гэтага выйграла б, бо наш навукова-тэхналагічны ўзровень развіцця трохі вышэй, чым у Расіі і Казахстане. Таму адзіная валюта дазволіла б нам хутчэй рухацца наперад. Праўда, нам, як і іншым удзельнікам саюза, прыйдзецца пастуліцца часткай суверэнітэту, але інтэграцыя немагчыма без кампрамісаў і ўзаемных уступак. Нельга быць разам і адначасова абсалютна незалежнымі. Трэба нешта выбіраць.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА

■ Футбол

«НАДВОР'Е ПРОСТА «КРЭЙЗІ»

Нечаканы снег, які на выхадных белай коўдрай накрыў усю краіну, са скрыгатам зубоў узгадваюць цяпер не толькі кіроўцы і камунальшчыкі. У чарговым туры чэмпіянату Беларусі па футболе гульцам прыйшлося змагацца з сапернікам і капрызамі надвор'я. І далёка не ўсе з гэтага дзіўнага супрацьстаяння выйшлі пераможцамі.

Фота Яраслава ВАНКОВІЧА.

Снег у Гродне пайшоў нечакана. Літаральна за 40 хвілін да пачатку сустрэчы.

Субота. Бабруйск. Мясцовая «Белшына» актыўна імкнецца пакінуць зону аўтсайдараў, дзе кожная каманда толькі і чакае асечкі саперніка, каб абысці небараку ў турнірнай табліцы. «Нафтан», апанент «шыннікаў», наогул займае апошні радок, а таму біцца камандам у гэты дзень было за што. Матч на заснежаным полі праходзіць у шчырай барацьбе. Гаспадары двойчы здолелі дагнаць гасцей, а за некалькі хвілін да фінальнага свістка забілі чырвоным мячом пераможны гол. 3:2 — у стратэгічным плане вельмі важная вікторыя для каманды Аляксандра Сяднёва.

— Умовы для ўсіх былі аднолькавыя, аднак поле было ў дрэнным стане, — разважае Мікалай Бранфілаў, абаронца «Белшыны», які за гульнёй назіраў з трыбуны тамтэйшага стадыёна «Спартак». — І, як мне здаецца, ападкі перашкодзілі нам прадэманстраваць больш якасны футбол. Ці трэба было ў падобных умовах эканоміць сілы? Не, наадварот, трэба было паказаць, на што ты здольны, рыхтавацца сур'ёзна, каб гуляць на любым полі.

А вось нападаючы «Белшыны» Генадзь Блізнюк правёў увесь матч і адчуў на сабе ўсю любоў беларускага клімату.

— Надвор'е нас не песціла. Поле было поўнасцю ў снезе. Месцамі сустракаліся нават невялічкія сумёты. Я лічу, што добра падрыхтаваць яго было немагчыма: снег не раставаў. На першы план у такіх умовах выходзілі байцоўскія якасці.

Не менш снегу ў суботу было і ў Гродне, дзе мясцовы «Нёман» прымаў ФК «Мінск».

— Снег пайшоў нечакана. Літаральна за 40 хвілін да пачатку сустрэчы. Ведаеце, нават бака-выя лініі не было відаць. Прыйшлося ўсё прыбіраць у экстранным парадку. А што тычыцца экіпіроўкі, дык у нас усё падрыхтавана загадзя пад любое надвор'е. З ёй пытанняў не ўзнікала, — кажа Дзмітрый Барысейка, начальнік «Нёмана», які нават не можа ўзгадаць, калі пры падобных умовах Гродна прымаў афіцыйны футбольны матч.

Даволі аператыўна на кліматычную праблему адгукнуліся ў Жодзіне. Мясцовы «Тарпеда» таксама змагаецца за выжыванне, а таму было вельмі важна, каб матч адбыўся на нармальным газоне, у камфортных умовах. У выніку жодзінцы хоць і саступілі салігорскаму «Шахцёру», але работнікі стадыёна атрымалі падзяку ад Вадзіма Бразоўскага, галоўнага трэнера «аўтазаводцаў».

— Я лічу, што поле пасля такога «цунамі», калі параўнаць з тым, як у Гродне «Нёман» гуляў з «Мінскам», выглядала проста шыкоўна, — адзначыў пасля гульні Бразоўскі.

Аднак у чым жодзінскі сакрэт? «Справа ў тым, што калектыў стадыёна «Тарпеда» праявіў мужнасць, — тлумачыць Яўген Горыд, начальнік спартаб'екта. — Адступаць было няма куды, і работнікі геаічнай працаў, усімі верагоднымі сродкамі падрыхтавалі стадыён да гульні. Безумоўна, снегу мы не чакалі, але падагрэў поля ўключылі яшчэ напярэдадні матча. У эканамічным складніку — мы ў мінусе, але кіраўніцтва завода ў гэтым пытанні пайшло нам насустрач. Лічу, што поле было амаль у ідэальным стане».

Дарэчы, нядрэннае поле было і ў Барысаве, дзе на шляху да чарговага чэмпіёнства БАТЭ перайграў «Брэст». І калі барысаўчане ўжо маюць досвед гульні ў такіх пагодных умовах (матчы з кіеўскім «Дынама» і французскім ПСЖ у Лізе Еўропы), дык для пэўных футбалістаў гасцей снег у чарговы раз стаў адкрыццём.

— У Беларусі я гуляю ўжо даўно, толькі ў матчы з БАТЭ я ўсё роўна змерз, — з дрыжыкамі ў голасе ўзгадвае сустрэчу Сімон Агар, нігерыйскі паўабаронца «Брэста». — Я апранаўся цёпла, але нагам усё роўна было вельмі холадна. Добра, што хоць на полі не было снегу. Наступным разам надзець шапку? Напэўна, так і зраблю, калі дазволяць у шапцы гуляць.

Яшчэ адзін з тых, хто адчуў на сабе асаблівасці нашага клімату. — Паскаль Мендзі, сенегалец, які сёлета выступае за жодзінскае «Тарпеда». Увесь каментарый нашаму карэспандэнту ён суправаджаў добравядомым англійскім словам «крэйзі» (шалёны). Відаць, моцна ўразіў хлопца беларускі снег. «Надвор'е было проста «крэйзі». І гуляць было сапраўды складана. Што я магу зрабіць? Верыць у лепшае. Але ў маёй кар'еры ўжо ёсць пэўны досвед, калі і ў Расіі, і ў Літве я гуляў у падобных пагодных умовах. Таму ніякіх праблем, усё добра.

Між іншым, апошні тур першынства датуецца 25 лістапада, а таму яшчэ невядома, якое надвор'е будзе чакаць нашых мужных футбалістаў напрыканцы восені. Хлопцы, рыхтуйцеся!

Тарас ШЧЫРЫ

Адкрытае акцыянернае таварыства «Птушкафабрыка «Дружба»:

СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ, ЕЎРАПЕЙСКІ СТАНДАРТ

Сёлета ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» даказала, што яно здольнае забяспечыць унутраны рынак і экспартныя пастаўкі сваёй прадукцыяй у любых эканамічных умовах

АЙЧЫННАМУ ФЛАГМАНУ ПТУШКАВОДСТВА КРАІНЫ — 32 ГАДЫ

Сёння любы эканамічна адукаваны чалавек з Брэстчыны зможа адказаць на пытанне: «Хто робіць «пагоду» ў Баранавіцкім раёне па фарміраванні бюджэту? Адказ, можна не сумнявацца, будзе такім: «Птушкафабрыка «Дружба».

Адкрытае акцыянернае таварыства «Птушкафабрыка «Дружба» — на парозе чарговай працоўнай даты. Напярэдадні свята работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу краіны можна падвесці прамежкавыя вынікі сёлетняга года і зрабіць экскурс у гісторыю. Бясспрэчна, што за зусім невялікі ў маштабах гісторыі адрэзак часу тут навучылося выраблять з птушкі прадукцыю самай высокай якасці, у надзвычай шырокім асартыменце, на аснове перадавых тэхналогій. Адметна, і гэта стала добрай заканамернасцю, што на птушкафабрыцы побач з асноўнымі кіраўнікамі вытворчасці ўдала ўпісалася сельскагаспадарчая ніва, дзякуючы чаму тут за апошнія гады на прафесійнай аснове навучыліся выраблять малако і мяса буйной рагатай жывёлы, вырошчваць на яшчэ нядаўна «адвольных» землях збожжавыя культуры. Генеральны дырэктар ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Васіль Маркевіч, якія кіруе прадпрыемствам ужо амаль дзесяць гадоў, не без гонару адзначае: сёлетнія рэспубліканскія «Дажынкі» ў Горках яшчэ раз даказалі, што птушкафабрыка ў сваім развіцці знаходзіцца на правільным шляху. Прадпрыемства аказалася ў лідарах па намалоце зерневых культур: усяго было атрымана 36,6 тысяч тон зерневых. Можна сказаць, што дзякуючы наяўнасці вялікай колькасці сельскагаспадарчых угоддзяў, у работнікаў, якія заняты на палетках, з'явілася магчымасць паказаць сябе. І яны такую магчымасць скарысталі: адзін з працаўнікоў, які ва уборачны перыяд перайшоў на камбайн, стаў пераможцам па колькасці намалочанага зерня. Як вынік — чалавек з рук кіраўніка дзяржавы атрымаў ключы ад аўтамабіля. Цяпер на рахунку «Дружбы» ўжо тры такія машыны. А дзелегацыя ад птушкафабрыкі на свяце ў Магілёўскай вобласці склала аж 14 чалавек — трэць ад усіх прадстаўнікоў Брэстчыны. Час паказвае, што ў любых сітуацыях, нават самых складаных, насуперак усім эканамічным цяжкасцям, якія з'яўляюцца спадарожнікамі ў фінансава-гаспадарчай дзейнасці амаль кожнага прадпрыемства, тут знаходзяць выйсце, каб не толькі быць аплотам стабільнасці, але і дынамічна развівацца далей.

Знаўцы сельскагаспадарчай вытворчасці скажуць, што ўвесь сакрэт крыецца ў звычайным чалавечым фактары. У нашым выпадку — ва ўменні гендырэктара прадпрыемства Васіля МАРКЕВІЧА, які змог сабраць вакол сябе каманду аднадумцаў, належным чынам кіраваць усім вытворчым працэсам.

«ДРУЖБА» — НА ЭКСПАРТ

З'яўляючыся флагманам галіны, наша прадпрыемства адчувае сваю адказнасць за насычэнне рынку мясам птушкі, — гаворыць Васіль Пятровіч. — Што б мы там ні казалі пра харчовы рынак краіны, але ж птушкаводства — адна з самых інтэнсіўных галін у рэспубліцы. Паводле статыстыкі, на душу насельніцтва за год у нас прыпадае ў сярэднім 30 кілаграмаў мяса птушкі і 320 яек. Таму, нягледзячы на тэрытарыяльную перавагу сельскагаспадарчых земляў над плошчамі, якія займаюць птушнікі, па вялікім рахунку, мы былі і застаёмся прафесійна галіновым птушкаводчым прадпрыемствам. Бо нас і на ўнутраным рынку, і на замежных, гандлёвы брэнд «Дружба» асацыіруюць менавіта з курынятамі-бройлерамі і іншай разнастайнай прадукцыяй з мяса птушкі. Дарэчы, апошнім часам, калі на замежных рынках попыт на яе значна вырас і пакупніцкая цана стала даволі прывабнай для яе вытворцаў, у нас не толькі вырасла доля экспарту, што вельмі важна ў разрэзе адлаведнай дзяржаўнай палітыкі, але і павялічылася геаграфія паставак за межы Беларусі.

Безумоўна, Расія была, ёсць і застаецца стратэгічным партнёрам. Акрамя Масквы, Санкт-Пецярбурга і іншых буйных гарадоў Расійскай Федэрацыі, маршруты супрацоўніцтва з усходняй суседкай прывялі птушыную прадукцыю «Дружбы» аж на Камчатку. Шкада, канстатуе Васіль Маркевіч, што на Далёкі Усход пакупь не патрапіліі ахаладжаныя курыняты-бройлеры, бо іх годнасць захоўваня ўмяшчаецца ў стандартныя пяць дзён, але і ў замарожаным выглядзе баранавіцкія прысмакі будуць даспадобы любым гурманам з паўночных рэгіёнаў Расіі.

Зрошты, на прадпрыемстве выдатна разумеюць, што ў бізнэсе, нават паміж суседнімі братнімі краінамі, могуць узнікаць розныя жыццёвыя калізіі і спрэчныя сітуацыі, таму цяпер актыўна асвойваецца такі рынак збыту, як Казахстан. Свае зацікаўленасць да мясной прадукцыі з маркай «Дружба» ўжо выказалі прадстаўнікі дзелавых колаў з Алма-Аты і Кустаная.

Шмат гадоў нязменным лідарам калектыву птушкафабрыкі «Дружба» з'яўляецца генеральны дырэктар Васіль МАРКЕВІЧ. Яго пазітыўны настрой на працу перадаецца ўсім спецыялістам гэтага вядомага сучаснага прадпрыемства.

ЛЮДСКІЯ КАШТОЎНАСЦІ

Пытанне, што з'яўляецца самым каштоўным для сучаснага прадпрыемства, на птушкафабрыцы «Дружба» ўжо даўно не носіць рытарычны характар. На першым плане, безумоўна, гэта людзі. Сёння на ўсіх участках вялікага вытворчага холдынгу працуе каля 3500 чалавек. Генеральны дырэктар у якасці жарту расказвае гісторыю, што работнікі прадпрыемства адрасуюць часам яму даволі арыгінальныя пытанні. Маўляў, ці не зашмат апошнім часам створана камфорту каровам і птушкам? Не забыць бы людзей за такімі гаспадарчымі клопатамі! Васіль Пятровіч кажа, што ў гэтым пытанні з падтэкстам ёсць нешта, над чым трэба задумацца. Сапраўды, дом кароў пад музыку Моцарта, курынятам хутка казні нанач давядзецца расказваць, каб лепш расліі і неслися. Праўда, сам жа зазначае, што дысбалансу не будзе, бо да кожнага працоўнага чалавека тут ставяцца з павагай і цярпеннем. Па-першае, усе выгады, якіх шмат, для працаўнікоў птушкафабрыкі і ўсіх яе падраздзяленняў вызначаны ў калектыўным дагаворы. Па-другое, ёсць рэчы, якія дакументальна могуць быць не аформлены, але іх павінен улічваць кіраўнік прадпрыемства. Напрыклад, наведванне дысцыпліны сярод работнікаў далучаных гаспадарак. Васіль Маркевіч ужо неаднойчы прыводзіць у якасці добрага прыкладу факт, які сведчыць: людзі ў нас у асноўным працавітыя і цярплівыя. Проста парчок ім трэба даць шанец, каб выправіцца, стаць на шлях ісціны. З гэтай нагоды, паводле яго слоў, успамінаецца сход у гаспадарцы «Пачапава», дзе далучэнне да птушкафабрыкі «Дружба» пачынці за выратавальную саломінку. Дык вось, падчас пасяджэння аж 7 трактарыстаў выказалі пажаданне заказіравацца ад пп'ятніцы. Без аніякага прымусу і дадатковых умоў працаўладкавання. Гэты прыклад паказаў, што ў кожным чалавеку ёсць душа. Трэба толькі ўмець яе раскрыць, накіраваць людскоя ўменне і вольт у необходнае рэчышча. А для гэтага ты павінен быць не толькі бізнэсменам і эканамістам, але яшчэ і псіхолагам, і педагогам.

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І СУЧАСНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ

Цэх забою і перапрацоўкі мяса птушкі. Аператар Наталля Азарка адсочвае якасць пасля апрацоўкі птушыных тушак у камеры павятранага капельнага ахаладжвання.

І прыбытковасць. У сваю чаргу яны залежаць ад перадавой тэхналогіі вытворчасці і своечасовага тэхнічнага пераўзбраення.

Сёння наша прадпрыемства — адно з самых сучасных у СНД і Усходняй Еўропе. І гэта прызнаюць і нашы партнёры, — зазначае **генеральны дырэктар ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Васіль МАРКЕВІЧ.** — Я ўжо неаднаразова казаў пра гэта і кажу зноў: з самага пачатку мадэрнізацыі мы набывалі толькі самае сучаснае абсталяванне. — «Першай ластаўкай» у плане істотнага абнаўлення можна было лічыць новы забойны цэх, пабудаваны ў пачатку 2005 года за кошт крэдыту нямецкага банка DZ Bank, узятага пад гарантыі беларускага. Вынікам такога смелага для нас кроку стала адкрыццё новага цэха па забоі птушкі прадукцыйнасцю 6 тысяч галоў у гадзіну з сучасным абсталяваннем і тэхналогіяй. Цэх адлавядае міжнародным стандартам Суцэнтнай Гандлёвай Арганізацыі ISO-9000.

Прафесійны падыход да вырошчвання і забою птушкі, упэўнены кіраўнік прадпрыемства, — гэта шлях да выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі. Пры гэтым беспарабойная і эфектыўная работа тэхналагічнага абсталявання залежыць не толькі ад фірмы-вытворцы, але і ад спецыялістаў, якія адказваюць за эксплуатацыю, тэхнічнае абслугоўванне і рамонт. У 2009 годзе адкрыўся цэх на 3000 галоў забою, што дазволіла максімальна выключыць работу ў выхадныя і святочныя дні без павелічэння колькасці работнікаў. Пры гэтым пастаянна на працягу тэхналагічнага працэсу забою вядзецца рэгулёроўка.

Угоцуле, за апошнія 5-7 гадоў птушкафабрыка «Дружба» даволі значна мадэрнізавалася. Замест старых лініі канца мінулага стагоддзя, якія не адпавядаюць высокай прадукцыйнасці і стабільнасці якасці прадукцыі, расходавалі шмат электраэнергіі, часта выходзілі са строю і прастойвалі ў час рамонту, з'явілася сучаснае абсталяванне вядучых суседніх вытворцаў — хуткаснае, дакладнае, эканомнае. Як правіла, па сваёй магутнасці новыя лініі не толькі значна больш прадукцыйныя, але займаюць значна менш месца, расходуюць у некалькі разоў менш электраэнергіі, і не выдаюць браку. Зніжэнне выдатку прыносіць як дадатковы прыбытак фабрыцы, так і дазваляе не павышаць цэны.

Участак упаковкі птушыной прадукцыі на экспарт.

ІМПАРТУ — БЫЦЬ!

Апошнім, трэцім друкаром Любчанскай друкарні быў Ян Ланге — эмігрант з Польшчы, лютэранін. Вядомыя толькі два выданні з яго іменем у выходных звестках. Гэта «Гадзіннік, альбо Памятка... пакуты і смерці збавіцеля» Мацея Гласкоўскага і каляндар «Кнігі гадавіка першая частка, гэта значыць стары і новы каляндар гадавых свят», складзены Стэфанам Фурманам.

Чаму ж даследчыкі культуры лічаць гэтую друкарню фенаменальнай? Таму што ні адна пратэстанцкая друкарня ў Вялікім Княстве Літоўскім не існавала так доўга, як гэтая. Прычым выпусціла яна не толькі шмат твораў розных канфесій, але і самыя розныя свецкія выданні.

Эпідэміі і войны сярэдзіны XVII ст. разбурылі Любчу. З таго часу выданне кніг у ёй не аднаўлялася. Нічога з друкарскага абсталявання не захавалася. Сёння не вядома нават месца размяшчэння былой друкарні.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

АДТУЛЬ МОЖНА БЫЛО ВЫЙСЦІ ТОЛЬКІ ПРАЗ ДЫМ

Прыгадаць балючыя перажыванні нашым суайчыннікам дапамагла кніга «Лагер смерці Асвенцым. Жывыя сведчанні Беларусі»

Вось чым дзеліцца ў ёй Пётр Андрэевіч Хаменка, былы вязень Асвенцыма:

«...Шлях па фашысцкіх засценках ён пачаў у Глухаўскай турме. Затым быў Канатоп — канцлагер пад адкрытым небам. У хуткім часе ўсіх вязняў сагналі ў вагоны з надпісам «партызаны» — і на Захад. Польшча, незразумелая затрымка ў Познані. Зноў у вагоны. Нечаканы прыпынак на нейкай станцыі. На вуліцы чулася размова па-руску — гэта былі ўласаўцы. Прывезеных пагналі ў лагер. Ён сустрэў іх моцным брэхам сабак і надпісам на варотах па-нямецку: «Праца робіць вольным». Гэта быў Асвенцым. Вязняў апранулі ў паласатую робу, абулі ў драўляныя калодкі і адправілі ў драўляныя баракі. Там пракляймілі. Чалавека з імем Пётр Хаменка больш не існавала — быў вязень пад нумарам 120519. На ўсіх праверках выклікалі толькі па нумару. Не адказаў — 25 удараў. За спазненне з адказам — столькі ж. Працавалі вязні на пабудове каналаў для арашэння зямлі. Кармілі хлебам, які пах не мукой, а драўнянымі апілкамі, — 150 грамаў. А яшчэ давалі бручку, баланду і каву. На гэтым звярыным харчы людзі павінны былі вытрымаць 12-14 гадзін непасільнай працы. Паміралі як мухі — на хаду, у час работы і ў час сну. Кожны месяц праводзілася селекцыя, адбор: усіх распраналі,


Кузьма Козак — дырэктар гістарычнай майстэрні, адзін са складальнікаў кнігі.

адбіралі аслабелых і знямоглых і па 40-50 чалавек адпраўлялі адразу «на свабоду». Папаўнялі недахоп рабочай сілы часцей яўрэямі, якіх прывозілі з усёй Еўропы, эшалонамі. Суцяшалі, што гэта часова: маўляў, напішыце ліст сваім родным — і яны вас сустрэнуць. А насамрэч па напісаных адрасах праводзіліся аблавы, арышты, і новымі вязнямі папаўняліся канцлагеры...»

Гэтае сведчанне зачытаў **дырэктар замежнага вяшчання Беларускага радыё Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ**, які прысутнічаў на прэзентацыі выдання ў музеі Вялікай Айчыннай вайны. Ён адзначыў, што, акрамя ўспамінаў, у кнізе чытаецца гісторыя цэлых народаў, габрэйскага і цыганскага, якія павінны былі знікнуць з твару зямлі. Дагэтуль у гісторыі ў дачыненні ні да аднаго народа не была пастаўлена такая мэта — знішчэнне, ад немаўляці да самых старых людзей. Журналіст упэўнены, што такі ж лёс сустракаў і беларусаў: можа, іх адразу не палілі, аднак над малымі праводзілі доследы, наш народ галадаў, таксама цярпеў страшныя пакуты. З беларусаў хацелі зрабіць рабочую сілу, непісьменных людзей, якія проста працавалі б на рэйх, адзначае Навум Якаўлевіч.

Аляксандра Барысава — кіраўнік рэспубліканскага аб'яднання былых палонных канцлагераў, адна са складальнікаў кнігі.

«Чаму гісторыя Асвенцыма так і не ўпісалася ў кантэкст беларускай трагедыі? Можа, занадта моцны боль быў у Беларусі?..» Такімі пытаннямі задаецца Кузьма Козак — адзін са складальнікаў кнігі «Лагер смерці Асвенцым. Жывыя сведчанні Беларусі». Кузьма Козак адзначае: «Ёсць статыстыка загінулых у Асвенцыме: больш за 1 мільён габрэяў, 70 тысяч палякаў, 20 тысяч цыганоў, 15 тысяч савецкіх ваеннапалонных і 10 тысяч іншых нацыянальнасцяў. Пра беларусаў ні слова... У самім Асвенцыме вы таксама не знойдзеце нічога пра палонных з Беларусі». Атрымліваецца, мы зноў засталіся дзесьці з краю, мужны і шматпакутны народ, які, аднак, не ўмее захоўваць сваю памяць. Таму для нас гэта не проста кніга — яна запаўняе яшчэ адну белую пляму ў нашай, на гэты раз страшнай, гісторыі і адпускае на волю ўспаміны тых, хто некалі перажыў пакуты, аднак дагэтуль не мог адважыцца расказаць...

Кніга выдадзена сёлета выдавецтвам «Літаратура і мастацтва», аднак патрэба ў ёй з'явілася яшчэ тады... калі скончылася Другая сусветная вайна. Хоць і са спазненнем у некалькі дзесяцігоддзяў, кніга выйшла. На яе прэзентацыі прысутнічалі былыя палонныя канцлагераў. Яны разам, скрозь слёзы, дзяліліся ўспамінамі. **Кіраўнік рэспубліканскага аб'яднання былых палонных канцлагераў Аляксандра БАРЫСАВА**, якая сама з'яўляецца малалетняй палоннай нацысцкага лагера Асвенцым, расказала пра асабісты боль:

— Справа ў тым, што кніга магла б быць і больш змястоўнай, і больш дакументальнай, каб звярнуліся да гэтай тэмы раней, калі былі жывыя старэйшыя людзі, нашы браты і сёстры. Мы ведаем, якое стаўленне пасля вайны было да людзей, што вярнуліся з-за мяжы. Мы былі людзьмі другога сорту. Многія з нас не атрымалі вышэйшай адукацыі, не стварылі сем'яў, не маюць дзяцей, а многія засталіся інвалідамі. Дзяржава не звяртала на нас увагі. Але мы заставаліся патрыётамі, і ў лагерах годна сябе паводзілі, і пасля вайны дапамагалі адно аднаму, як маглі — тыя, хто выжыў. Зараз мы не прызнаны ахвярамі нацызму ў нашай краіне, мы аднесены да людзей, што пацярпелі падчас баявых дзеянняў. А лагер смерці Асвенцым патрэбна было «заслужыць» у Гітлера, таму што туды адпраўляліся сем'і і члены сем'яў партызанаў. Мы пастаянна называліся «kinder banditen» — «дзеці бандытаў» — з якімі можна было рабіць што заўгодна. Гэта не сакрэт, што доктар Менгеле і іншыя нямецкія дактары праводзілі ўсялякія зверскія доследы над намі, адбіралі дзяцей на анямечванне і на доследы, і што там было шмат беларусаў. На сучасных звестках, туды вывезена 6 тысяч беларусаў. Але гэта недакладная статыстыка. Туды ішлі і ішлі эшалоны — у асноўным з Віцебскай вобласці. У 1943-м Гітлер выдаў указ, каб знішчаць усіх, хто дапамагае бандытам (а для фашыстаў бандыты — гэта партызаны), а каго не паспеюць — вывозіць адразу да печаў крэматорыя Майданека, Асвенцыма, а адтуль выхаду не было, толькі праз дым... Адзін нацыст у Асвенцыме казаў: «Вы сюды не ў санаторый прыехалі. І выхад вам адсюль толькі праз дым печаў крэматорыя». З любога ўспаміну вынікае, што туды звозілі сем'і партызанаў. А ў Беларусі быў свой асвенцым: мы ведаем, што фашысты знішчалі ўсіх, хто хоць крыху дапамагаў партызанам або знаходзіўся ў партызанскай зоне, — гарэлі нашы вёскі з людзьмі. І гэта ўсё было «Асвенцым» — пекла на зямлі.

Аляксандры Барысавай, як кіраўніку аб'яднання былых палонных канцлагераў, часам даводзілася вельмі няпроста: у 2007 годзе былі адменены льготы, у тым ліку для палонных нацызму (бясплатны праезд, беларускія лекі, тэлефонныя размовы). Атрымалася, што людзей, якія перанеслі такія страшныя фізічныя і душэўныя пакуты, прыраўнялі да ўсіх астатніх. Аляксандра Васільеўна моцна перажывала, думала, што нешта недапрацавала, не даказала, калі для грамадства не зразумела, чым асаблівыя людзі, якія сталі ахвярамі фашызму. А пры стварэнні кнігі, акрамя фінансавай праблемы, была яшчэ адна — маральная. «А ці трэба варушыць у памяці людзей тое страшнае, што яны даўно перажылі? — думала Аляксандра Барысава. — Яны зноў будуць пакутаваць. І ці варта бударажыць душы памерлых?» Тады складальнікі кнігі звярнуліся ў епархію, і мітрапаліт Філарэт даў ім сваё бласлаўленне на гэтае выданне. Асабісты боль, агучаны і з'яднаны з іншым, пэўна, лягчэй перанесці.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ПРАВЕР СЯБЕ

ПЫТАННІ ДЛЯ ЦІКАЎНЫХ (ТУР 6)

Дзень добры, шаноўныя чытачы «Ігуменскага тракту»! Прыемна разам з вамі блукаць па таямнічых і такіх далёкіх старонках гісторыі, чытаючы вашы лісты, адказы ў іх і тлумачэнні. Мінулы тур віктарыны, прымеркаваны да Дня маці, паказаў, што з жанчынамі нашай мінуўшчыны вы, хоць і завочна, але добра знаёмыя. А найлепшыя стасункі з імі, відавочна, маюць **Аляксандр Ганчароў** з аграгарадка Нісімкавічы Чачэрскага раёна і **Уладзімір Драбышэўскі** з Полацка, якія пазналі ўсе жаночыя постаці і адказалі дакладна. Правільныя адказы былі такімі: 1. Палеалітычная «Венера»; 2. Францішка Уршуля Радзівіл; 3. Барбара Радзівіл, (06.12.1520 — 08.05.1551); 4. Рагнеда, Гарыслава, Анастасія; 5. Ефрасіння Полацкая; 6. Ганна Кацярына Радзівіл (23.09.1676 — 23.10.1746); 7. Стэфанія Міхайлаўна Станюта; 8. Пакроў Прасвятой Багародзіцы.

Наступны тур віктарыны, пытанні да якога, як заўсёды, падрыхтавалі **супрацоўнікі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь,** прысвечаны беларускаму пісьменству. Згадзіцеся, яшчэ адна добрая тэма, у якой ёсць што даследаваць і над чым падумаць. Таму чакаем вашых адказаў на наступныя пытанні:

1. Дзе на тэрыторыі Беларусі былі знойдзены берасцяныя граматы?

2. Як называлася прыстасаванне для пісьма ў выглядзе драўляных блокаў з паглыбленнямі, якія запаўняліся воскам?

3. Як называўся прадмет у выглядзе стрыжня даўжынёй 8-13 см, завостраны на адным канцы і з плоскай лапатачкай на другім, якім з X ст. на Русі карысталіся для пісьма.

4. Якую назву мела сярэдневяковая майстэрня па вырабе рукапісных кніг?

5. У якім горадзе была заснавана першая на тэрыторыі ўсходніх славян друкарня, з якой у 1522 г. выйшла ў свет «Малая падарожная кніжка» Ф. Скарыны?

6. Папяровы ярлык, які наклейваўся на кнігу, пераважна на ўнутраны бок пераплёту, дзе было пазначана імя і прозвішча ўладальніка бібліятэкі і малюнак, які лаканічна апавядаў аб яго прафесіі, інтарэсах.

7. Дзе размяшчалася самая старажытная на беларускіх землях бібліятэка?

8. Якому беларускаму паэту належыць верш «Перапісчык»?

ВАЙНІЛОВІЧЫ

Вайніловічы — старажытны беларускі шляхецкі род з чатырохсотгадовай гісторыяй

Прозвішча Вайніловічы добра вядома жыхарам Беларусі: носьбіты гэтага прозвішча пакінулі значны след у гісторыі нашай краіны, развіцці яе эканомікі і культуры.

Вайніловічы — старажытны беларускі шляхецкі род герба «Сыракомля». Гісторыя гэтага роду налічвае больш за чатырыста гадоў. Прадстаўнікі роду займалі розныя пасады ў мясцовай адміністрацыі Вялікага Княства Літоўскага: падчашы мсціслаўскі *(Траян Вайніловіч)*, падчашы слонімскі *(Леў Казімір Вайніловіч)*, стольнік мазырскі *(Людвік Вайніловіч)*, каралеўскі сакратар, харужы ваўкавыскі, сеймавы пасол *(Тамаш Вайніловіч)*, стольнік навагрудскі *(Габрыэль Вайніловіч)*, стольнік мазырскі *(Крыштоф Вайніловіч)*, падваявода навагрудскі *(Ян Вайніловіч)*, маршалак шляхты Слуцкага павета *(Антоній Вайніловіч)*, маршалак шляхты Навагрудскага павета *(Юзаф Вайніловіч)* і іншыя. Род меў кроўныя сувязі з іншымі славутымі родамі беларускай зямлі — Манюшкамі, Ваньковічамі, Адынцамі. Вылучаецца некалькі ліній роду: *савіцка-пузаўская лінія* (Мазырскі павет, XVII ст.), макранская (Пінскі павет, XIX ст.), *нянькаўская* (Навагрудскі павет, XIX ст.). Найбольш вядомыя прадстаўнікі роду: *Антон Вайніловіч* (1801 — 1845), дваранскі рэвалюцыянер; *Восіп Вайніловіч* (1860 — 1890), рэвалюцыянер-народнік, адзін са стваральнікаў Варшаўскага нарадавольніцкага гуртка беларускіх студэнтаў. З імем прадстаўніка роду — *Эдварда Адама Вайніловіча* (1847 — 1928) — непасрэдна звязаны адзін з адметных архітэктурных помнікаў Мінска, своеасаблівая візітная картка горада —Чырвоны касцёл імя святых Сымона і Алены.

Эдвард Вайніловіч быў не толькі адным з найбагацейшых памешчыкаў, але і адным з самых адукаваных людзей Мінскай губерні ў другой палове XIX стагоддзя. У памяці нашчадкаў ён застаўся як мецэнат, грамадскі і палітычны дзеяч, шчыры хрысціянін. Сваё багацце Вайніловіч нажыў уласнай працай. Скончыў знакамітую Слуцкую гімназію, затым Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Працаваў інжынерам на Пуцілаўскім заводзе, праходзіў стажыроўку на заводах Германіі і Бельгіі. Там навучыўся збіраць лакаматывы, вадзіць паравозы. Завяршыў адукацыю ў Сарбоне і Сілезіі. Эдвард Вайніловіч абіраўся ганаровым міравым суддзёй Слуцкага павета, старшынёй Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, быў членам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі. Сам Пётр Сталыпін за здольнасці і рэфарматарскія адносіны да працы называў Вайніловіча «мінскім Бісмаркам», прапаноўваў яму заняць у сваім урадзе пасаду віцэ-прэм'ера або міністра сельскай гаспадаркі. Але Эдвард Вайніловіч прыняў рашэнне працаваць на карысць эканомікі і дабрабыту свайго краю: адкрыў камерцыйнае вучылішча, удасканальваў сельскагаспадарчую працу на аснове навейшых дасягненняў, фінансаваў першае легальнае беларускае выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца». Быў шчырым хрысціянінам: ахвяраваў грошы на будаўніцтва касцёлаў, цэрквяў, сінагогаў і мячэцяў, пабудову інтэрнатаў для дзяцей-сірот у Клецку і Капылі. Эдвард Адам Вайніловіч заўсёды быў прыхільнікам незалежнай Беларусі, выступаў адным з ініцыятараў вядомага Слуцкага паўстання 1920 года. У 1920 годзе насуперак сваёй волі шляхціц пакінуў Беларусь і эміграваў у Польшчу. Там у горадзе Быдгашчы і закончыўся яго зямны шлях. Ён заўсёды марыў вярнуцца на радзіму, і гэта адбылося: вернікі-католікі зрабілі ўсё магчымае, каб перанесці прах Эдварда Вайніловіча ў Мінск. 11 чэрвеня 2006 года ён быў перазахаваны каля сцен велічнага Чырвонага касцёла.

На жаль, жыццё не было літасцівым да гэтага чалавека. Вялікае гора напаткала яго сям'ю: у 1897 годзе ад «іспанкі» памёр яго дванаццацігадовы сын Сымон, а ў 1903 годзе, не дажыўшы аднаго дня да свайго дзевятнаццацігоддзя, памерла дачка Алена. І толькі вера ў Бога дапамагла Вайніловічу выжыць. Пасля трагічных падзей Вайніловіч прымае рашэнне ахвяраваць вялікія сродкі на ўзвядзенне ў Мінску Чырвонага касцёла імя святых Сымона і Алены. На працягу сваёй больш чым стагадовай гісторыі, нягледзячы на рэвалюцыю, дзве сусветныя вайны і смутныя часы ваяўнічага атэізму, касцёл не быў разбураны і сёння застаецца адным з найпрыгажэйшых архітэктурных помнікаў сталіцы і сімвалам веры.

Паходжанне прозвішча

Прозвішча *Вайніловіч* было вядома ў старабеларускіх пісьмовых крыніцах у XV стагоддзі. Існуе некалькі версій паходжання гэтага прозвішча. Паводле адной з версій, прозвішча вядзе свой пачатак ад назвы вёскі Вайнілы. Аднак гэтую версію нельга лічыць праўдападобнай, паколькі вяска супярэчыць усім заканамернасцям антрапанімікі — раздзела анамастыкі, які вывучае асабовыя імёны і прозвішчы. Паводле другой версіі, прозвішча паходзіць ад імя заснавальніка роду — чалавека з іменем *Вайніла*. На нашу думку, гэтая версія навукова апраўдана. Аднак спрэчным застаецца пытанне адносна паходжання самога імені *Вайніла*. Гэта неаднаразова сустракаецца ў беларускіх помніках XV — XVII стст. Некаторыя даследчыкі разглядаюць гэтае імя як народна-размоўную форму мужчынскага асабовага імені Война. Існуе таксама меркаванне, што імя *Вайніла* з'яўляецца скарочанай формай старажытных двухасноўных славянскіх імёнаў *Воинег* (першы кампанент *вой* азначае *воін*, а другі мог утварыцца ад назоўніка слава або дзеяслова *славіць*), *Воигост* (частка *гост* у старажытнасці мела значэнне *«купец»*), *Воинег* (у старажытнасці слова нега мела значэнне «раскоша»), *Воибор* (той, хто змагаецца з воінамі, перамагае воінаў), *Воімір* (той, хто з'яўляецца воінам грамадства) і інш. Ёсць усе падставы для прызнання гэтай версіі, паколькі аналагічна ўтвараліся і шматлікія іншыя старажытныя імёны, а затым і прозвішчы тыпу *Будзіла* ад *Будзімір, Гасціла ад Гасцімір, Гасціслаў* і іншыя. Працэс спрашчэння складаных двухасноўных імёнаў быў характэрны для XIII стагоддзя, калі ў сувязі з шырокім распаўсюджваннем хрысціянства прадукцыйнасць складаных славянскіх імёнаў знізілася. Прыхільнікі літоўскага паходжання сцвярджаюць, што імя *Vainila* з'яўляецца скарочанай формай літоўскіх двухасноўных імёнаў *Vainibutas (Vaini-butas), Vaingedas (Vain-gedas), Barvainas (Bar-vainas), Butvainas (But-vainas), Dargvainas (Darg-vainas), Gedvainas (Ged-vainas)*. У гэтых імёнах вылучаецца кампанент *-vain-* (vaina «віна, прычына»), які адзначаецца ў аснове дзеяслова *vainoti (vain-oti)* «абвінавачваць каго-небудзь», «сварыцца», «лаяць». Дапускаюць, што такую мянушку мог атрымаць чалавек з-за асаблівасцяў свайго характару: ён быў строгім чалавекам, з няпростым характарам.

Сучасныя Вайніловічы

Вайніловічы мелі вялікія зямельныя ўладанні ў Мазырскім, Пінскім, Навагрудскім і Слуцкім паветах. На жаль, ад былых радавых маёнткаў амаль нічога не засталося. Але прозвішча *Вайніловіч* сустракаецца ў дзесяці раёнах Беларусі: Аршанскім і Сенненскім раёнах Віцебскай вобласці, Бярэзінскім, Мінскім, Нясвіжскім і Уздзенскім раёнах Мінскай вобласці, Асіповіцкім, Горацкім і Клімавіцкім раёнах Магілёўскай вобласці, а таксама ў горадзе Мінску. Неаднаразова вышэйзгаданае прозвішча адзначаецца на тэрыторыі Літвы і Польшчы. Атрымаць адказ на пытанне, ці маюць якое-небудзь дачыненне носьбіты гэтых прозвішчаў да знакамітага роду, могуць дапамагчы толькі архіўныя пошукі. Спарадычна ў сучаснай беларускай іменаслоўнай сістэме адзначаюцца прозвішчы *Вайніла* (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці, Валожынскі раён Мінскай вобласці), *Вайнілка* (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці, Мядзельскі раён Мінскай вобласці). На беларускіх землях захаваліся старажытныя паселішчы з назвамі *Вайнілавічы* (вёска ў Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці, Нясвіжскім раёне Мінскай вобласці), *Вайнілаўцы* (вёска ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці), *Вайнілаўшчына* (вёска і хутар у Іўеўскім раёне Гродзенскай вобласці, Валожынскім і Стаўбцоўскім раёнах Мінскай вобласці), *Вайніліха* (хутар у Іўеўскім раёне Гродзенскай вобласці), *Вайнілы* (Чавускі раён Магілёўскай вобласці), *Вайнілава* (вёска ў Чэрвенскім раёне Мінскай вобласці).

Вайніловічы
Vainiavičiai
Vainilaičiai
Wysokie
Wysokiemu
Wysokiemu Wysokiemu
Wysokiemu Wysokiemu
Wysokiemu

БЛУКАЮЧЫ ШЛЯХАМІ КОЛАСА

МОЖНА ДАВЕДАЦЦА АБ ТЫМ, ШТО ДЗЯДЗЬКА ЯКУБ НАПІСАЎ ПРА ЛАТУШКУ, ПРЫ ЯКІХ АБСТАВІНАХ У СЯМ'І МІЦКЕВІЧАЎ УПЕРШЫНЮ ВАРЫЛІ ВАРЭННЕ І ЯК СПРАВЫ Ў ШКОЛЕ ІМЯ КЛАСІКА

Рэспубліканская свята паэзіі «О, Беларусь, ты сэрца і душа...» з нагоды 130-годдзя Якуба Коласа прайшло на радзіме паэта ў Стаўбцоўскім раёне. Свята адбылося пры падтрымцы Міністэрства культуры, Мінскага аблвыканкама, Стаўбцоўскага райвыканкама і літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. У ім узялі ўдзел пісьменнікі, акцёры, музычныя калектывы і, безумоўна, сваякі самога Якуба Коласа. Удзельнікі свята наведалі Стоўбцы, хутары Альбуць, Акінчыцы, Смольню, Мікалаеўшчыну, дзе ў дзяцінстве жыў Канстанцін Міцкевіч, будучы пясняр Якуб Колас. І дарогу паміж якімі цяпер называюць «Шляхам Коласа». Сёння ўсе хутары ўваходзяць у філіял «Мікалаеўшчына» і з'яўляюцца яго мемарыяльнымі сядзібамі. Апагеем свята стаў канцэрт у Цэнтры культуры, што ў Новым Свержані. Але пра ўсё па парадку.

Хаты лесніка

Надвор'е ў дзень вандроўкі па мясцінах Коласа ніяк нельга было назваць святочным. У Стоўбцах, першым пункце падарожжа, нас сустрэлі караваем і рознакаляровымі шарыкамі, якія трымалі не менш рознакаляровыя (ад ветру, дажджу і холаду) школьнікі. Яны стаялі ўздоўж вуліцы Цэнтральнай. Імправізаваная сцэна ў Стоўбцах аказалася прыстасаваным пад рэспубліканскае свята транспартным прыпынкам. Яго злёгку задрапіравалі нябесна-блакітнай і фіялетавай тканінай, падключылі гукавую тэхніку і запрасілі музыкантаў з цымбалами. Беларуская вынаходлівасць часам проста агаломшвае.

Далей мы выправіліся ў Акінчыцы, дзе нас частавалі свойскімі яблыкамі, паказвалі дзіцячыя малюнкі да «Новай зямлі», а паэт Віктар Шніп чытаў «Баладу Якуба Коласа». Акінчыцы — першае месца службы бацькі паэта, лесніка Міхаіла Казіміравіча. Акурат у Акінчыцах мы сустрэлі энергічную і добразычлівую Соф'ю Пятроўну Міцкевіч, жонку Юрыя Міхайлавіча, унука Коласа, якая з'яўляецца яшчэ і загадчыцай філіяла «Мікалаеўшчына». Менавіта таму, што сёння клопат па доглядзе за сядзібамі кладзецца на плечы сваякоў Коласа, сядзібы дыхаюць жыццём. Сваякам жа неабыякава. А большасць сядзіб знаходзіцца ў лесе, далекавата ад цывілізацыі. Паспрабуй ты ўсё гэта хаця б аб'ездзіць ды правер. А таму менавіта сваякоў, поруч з дзядзькам Якубам, хацелася лічыць галоўнымі на гэтым свяце. Асабліва Міхася Канстанцінавіча Міцкевіча, малодшага сына паэта. Маўклівага, заўжды задуменнага, сур'ёзнага і маркотнага. Заўсміхаўся ён толькі напрыканцы вандроўкі. Усё больш — думаў пра сваё. Часам — каментаваў, як у Альбуці. Там захаваўся 500-гадовы дуб, пад якім Якуб Колас разам з братам адпачываў, калі пасвіў кароў. «Во які! І гаміоніць пра нешта сваё! Успамінае...» — маркотна заўважае Міхасць Канстанцінавіч, пакуль іншыя спрабуюць вызначыць, колькі ж абхватаў мае гэты дуб-помнік.

У Альбуці (чацвёртае месца службы бацькі, які быў радзівілаўскім лесніком) сям'я Міцкевічаў пражыла 12 гадоў. Тут Якуб Колас навучыўся чытаць, напісаў першы верш. Адсюль пайшоў вучыцца ў школу ў вёсцы Мікалаеўшчына, а потым — у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. У Альбуці, паводле расповедаў, захоўваецца саламяны куфар, які зрабіў Кастусю дзядзька Антось. Якуб Колас, ужо будучы членам-карэспандэнтам Акадэміі навук, усё адно карыстаўся гэтым куфрам. А калі сябры-навукоўцы прапанавалі скінуцца яму на скураны партфель, Колас адмовіўся. Сказаў, што з такім куфрам усе яго пазнаюць.

У Смольню Колас упершыню прыехаў у 1911 годзе, адседзеўшы ў мінскім астрозе за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе. Хата ў Смольні стала першай уласнай хатай сям'і Міцкевічаў. Праз 8 гадоў пасля смерці бацькі Коласа Міхала. Тут і сёння растуць ліпкі, якія пісьменнік пасадзіў тады, каб у Смольні стала троху весялей. Тут усталяваны камень з нагоды першай сустрэчы Якуба Коласа і Янкі Купалы ў 1912 годзе. У Смалянскай хаце вельмі шмат аўтэнтычных рэчаў. Вялікая знаўца сямейных баек Соф'я Пятроўна расказала, напрыклад, пра медны тазік.

— Якуб Колас пастаянна тут не жыў, прыязджаў на летнія канікулы. А калі жаніўся ў Пінску з Марыяй Дзмітрыеўнай Каменскай, яны прыехалі сюды разам. А тут столькі суніц было, пазёмкі называліся, — па зямлі ягады сцелюцца, — распавядае Соф'я Міцкевіч. — Марыя Дзмітрыеўна вельмі многа назбірала. «А што ж з імі рабіць?» — звярнулася да маці Коласа Ганны Юр'еўны. Тая прапанавала пасушыць. А Марыя Дзмітрыеўна кажа: «Не, лепей я варэнне звару». Тады ж ніхто не ведаў, што такое варэнне, як цяпер. А Марыя Дзмітрыеўна была адукаваная, з сям'і святара. Яна папрасіла мужа Канстанціна купіць медны тазік, каб варэнне варыць.

Соф'я і Юрый Міцкевічы. Руплівыя захвальнікі коласавай спадчыны. Усе муляжы для сядзібы ў Акінчыцах Соф'я Пятроўна зрабіла сама.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Школа

У Мікалаеўшчыне стаіць помнік Коласу з надпісам «Краю Савецкі, новыя людзі! Песняй вітаю я вас!» Да яго ўдзельнікі свята на чале з міністрам культуры Паўлам Латушкам усклалі кветкі. Гэты бронзавы бюст навёў мяне на развагі пра тое, што ў жыцці не заўжды ўсё так, як напісана. Не думаю, што Колас, якога савецкая ўлада ў пэўныя моманты прымушала пісаць тое, што ёй было патрэбна, хацеў бы, каб на яго помніку было напісана нешта «прымусовае». Але што зробіш, бюст паставілі ў савецкія часы.

Яшчэ Мікалаеўшчына адметная школай імя Коласа. Менавіта гэтую школу, архітэктурна падобную на нясвіжскую альма-матэр паэта, Якуб Колас пабудаваў пасля вайны на ўласныя грошы. Сёння тут вучыцца трохі больш за 70 вучняў з навакольных вёсак. Навучанне вядзецца цалкам па-беларуску. Але шкада, што дзеці вырастуць, пераедуць у горад і пачнуць размаўляць на рускай мове.

— Гэта вельмі сумна, — пагаджаецца настаўніца пачатковых класаў Мікалаеўскай школы імя Якуба Коласа Святлана Козел. — Таму што тут дзеці размаўляюць па-беларуску не толькі на занятках, але па-за класнымі сценамі. Ім так зручней. І нават пераклад з замежнай мовы яны робяць на беларускую. А прыязджаюць у сталічныя ўніверсітэты, і там ад іх патрабуюць перакладаць на рускую мову.

У другім класе Святланы Іванаўны зараз усяго дзве вучаніцы. І наогул, колькасць вучняў з кожным годам памяншаецца...

Шлях

Дарога, якая злучае сядзібы, нездарма называецца «Шляхам Коласа». Па-першае, яна пабудавана па просьбе самога пісьменніка. Калі ён ужо быў прызнаны і ўплывовы і меў магчымасць прасіць аб такім. Па-другое, маляўнічая дарога ўпрыгожана ўнікальнымі драўлянымі скульптурамі, якія ў 1990-1992 гг. зрабілі самадзейныя мастакі-разьбяры (А. Маголін, С. Кляшчук, М. Карабава, І. Канавалюк, В. Парашчанка, Г. Дзяляндзік, І. Супрунчык) па ініцыятыве дырэктара музея Коласа Зінаіды Камароўскай і тагачаснага загадчыка аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама А. Грэкава. Драўляныя фігуры (усяго іх 12) з выявамі герояў коласаўскай «Новай зямлі» і іншых беларускіх вясковых персанажаў напаўняюць лес нейкай магіяй. Здаецца ўжо, што не толькі лес нешта шапоча і ўспамінае, але і самі гэтыя героі, як праваднікі сігналаў з іншых сусветаў, спрабуюць давесці нешта самае важнае.

Малодшы сын Якуба Коласа Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч на бацькавым Шляху.

Фота Таццяны РУСАКОВІЧ.

Праўда, па «Шляху Коласа» не дабраліся мы да адной сядзібы — трэцяга месца жыхарства сям'і Міцкевічаў — у Ластку. Яшчэ яго называюць Сухошчына. Старая хатка з гумном пасярод яловага лесу. І ў гады маленства Коласа, і сёння дабрацца туды няпроста. Даязджае ў Ласток хіба што звяздоўскі фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук. Дарэчы, вось і нядаўна ў выдавецтве «Беларусь» выйшаў фотаальбом Клешчука «Беларусь. Зямля песняроў», дзе змешчана шмат вельмі прыгожых фотаздымкаў мясцін Коласа і Купалы. Ласток, між іншым, сярод усіх мемарыяльных сядзіб з'яўляецца найбольш каштоўнай. Калі пабудовы ў Акінчыцах, Альбуці і Смольні адноўлены па архіўных матэрыялах, то Ласток захаваў свой першапачатковы выгляд з невялікімі рэстаўрацыйнымі зменамі. Хата і гумно, пабудаваныя ў 1885 годзе (акурат з гэтага года па 1890-ы тут жылі Міцкевічы), захаваліся да нашых дзён.

Канцэрт

Якуб Колас не «забранзавеў», хаця яго яшчэ пры жыцці ўпарта спрабавалі зрабіць непрыступным ідалам, якога можна скарыстоўваць у сваіх мэтах. Яго вершы, простыя і добрыя, кранаюць гэтай сваёй прастатой і шчырасцю. Адна мая знаёмая захоплена сказала пра «Новую зямлю»: «Гэта ж мала таго, што там ні слова хлусні, усё аўтабіяграфічнае, дык яшчэ і зарыфмавана!» Шкада, што так, як размаўляюць героі Коласа, па-беларуску сёння гавораць усё менш і менш. Вёска дажывае свой век... А беларуская мова ўсё больш перасяляецца ў сталіцу, дзе канцэнтрацыя мастакоў і паэтаў на квадратны метр шчыльней, чым у іншых кутках Беларусі.

На канцэрце ў Новым Свержані (тут, дарэчы, некалі хрысцілі Якуба Коласа), чыталі вершы, спявалі і танцавалі. Акцёры Валянцін Салаўёў, Марыя Захарэвіч і Аляксандр Кашпераў выканалі творы Якуба Коласа — урыўкі з «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі», верш «Не бядуй!». Песні спявалі хор музычнай капэлы «Санорус», артыст Валерый Скаражонак; народны вакальны ансамбль «Берагіня», у рэпертуары якога больш за 10 песень на вершы Коласа і які можна было б смела адпраўляць на «Еўрабачанне» (бабулек ужо не адправіш!) — такія ў іх выдатныя касцюмы спрадвечна беларускіх колераў, такое мілагучнае шматгалоссе. Салістка Маладзёжнага тэатра эстрады Ганна Благава выканала песню на словы Коласа «Маладосць». «Зоркай» канцэрта стаў, вядома ж, Пётр Ялфімаў. Калектыў з Мікалаеўшчыны «Коласавы землякі» праспяваў прыпеўкі ў стылі «А чаго ж ты, мілы, без валос застаўся? Не было расчоскі, граблямі часаўся!». Драйвовыя хлопцы з Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята» неверагодна жвава і прыгожа выканалі польку і кадрылю. Галоўным паказчыкам маштабнасці свята паэзіі была запрошаная вядучая — усмешлівая Алена Спірыдовіч. Наогул, усё было настолькі энергічна і кранальна, што напрыканцы канцэрта, калі спявалі «Мой родны кут» на музыку Ігара Лучанка, уся зала падпявала стоячы. Прычым разам з міністрам культуры. Што не магло не расчуліць. Наогул, мне здаецца, усім відавочна імпануе імкненне Паўла Паўлавіча быць бліжэй да людзей і культуры, на простых, часта ўласных прыкладах паказваць, што культура — гэта важна. Бо гэта, бясспрэчна, так і ёсць. Гэтым разам міністр прачытаў урывак з Коласавай «Рыбаковай хаты». Кніжку з гэтай паэмай яму неяк падарылі ў адным з філіялаў музея Коласа. Ва ўрыўку якраз узгадваецца нейкі Сымон Латушка — «натура вольная, як птушка, рыбак заядлы і дудар». Аднафамілец? Сваяк? Сапраўды, часцей перачытвайце класіку. Можа, там і пра вас нешта напісана.

— Гэта быў для мяне ўрок таго, што трэба часцей чытаць беларускіх класікаў. Больш ведаць пра тое, што яны стварылі для нашай культуры, — мяркуе міністр культуры Павел Латушка.

Але галоўным «гваздом» канцэрта было выступленне сына Коласа Міхася Канстанцінавіча. Звычайна ён не любіць шмат гаварыць на публіку. Гэтым разам таксама гаварыў ад сябе не шмат, затое прачытаў урывак з «Новай зямлі», якім шмат што сказаў.

Зоя СВЕТЛАЯ.



«Засмучаны Хрыстос» на раздарожжы. Шлях у Альбуць. Аўтар — скульптар па'дрэве Анатоль Маголін.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ТАКСАМА «ДАЧНІКІ»

На жаль, традыцыйна пасля заканчэння дачнага сезона ў садаводчых таварыствах з'яўляюцца крымінальныя «дачнікі». Маёмасць у дамах без гаспадароў прыцягвае да сябе амаратаў лёгкай нажывы. Напрыклад, толькі на тэрыторыі Віцебскай вобласці сёлета зарэгістравана больш за 610 крадзяжоў з дачных дамоў. На жаль, не ўсе зламыснікі, якія ўчынілі крадзяжы, абвінавачаны.

— У гэтым годзе праваахоўнымі органамі выяўлены тры злачынныя групы, якія спецыялізаваліся менавіта на крадзяжах з дачных дамоў на тэрыторыі абласнога цэнтра, Віцебскага і Гарадоцкага раёнаў. Зладзеі займаліся гэтым, пачынаючы з восені мінулага года да вясны гэтага, — расказвае **Аляксандр ЦЫВІНСКІ, намеснік начальніка аддзела па наглядзе за расследаваннем крымінальных спраў упраўленнем Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці.** — Усе сямёра ўдзельнікаў названых груп — непрацуючыя маладыя мужчыны ва ўзросце 22-25 гадоў, з якіх толькі двое раней не былі судзімыя. На іх рахунку больш за 45 фактаў крадзяжоў з дачных дамоў. Кошт выкрадзенай імі маёмасці — каля 140 мільёнаў рублёў.

Аб'ектамі крадзяжоў была розная маёмасць, прыдатная для продажу, пачынаючы ад сельскагаспадарчага інвентару і адзення і заканчваючы бытавой тэхнікай.

У цяперашні час віна траіх даказана ў судзе. Яны асуджаны да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу. Крымінальныя справы ў дачыненні да яшчэ чатырох разглядаюцца ў судах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Даты Падзеі Людзі

1921 год — адкрыты Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У яго ствараннi ўдзельнічалі акадэмік Я.Ф.Карскі, прафесары В.П. Волгін, Л.С. Мінор, У.І. Пічэта (першы рэктар БДУ), Д. М. Пранішнікаў і іншыя. Сярод першых выкладчыкаў — М.В. Доўнар-Запольскі, К.М. Міцкевіч (Я. Колас), М.М. Нікольскі, У.М. Перцаў, навукоўцы з Масквы, Петраграда, Кіева. Навуковую літаратуру прыслалі Расійская кніжная палата, Кіеўскі, Маскоўскі і Петраградскі ўніверсітэты; перадалі ўніверсітэту свае бібліятэкі Карскі, Янчук і іншыя. У Вялікую Айчынную вайну навукова-матэрыяльная база ўніверсітэта была вывезена акупантамі або знішчана. Заняткі аднавіліся ў кастрычніку 1943 года на ст. Сходня пад Масквой, з верасня 1944-га ўніверсітэт зноў у Мінску. Сёння БДУ з'яўляецца вядучай вышэйшай навучальнай установай у сістэме нацыянальнай адукацыі Рэспублікі Беларусь і буйным вучэбна-навукова-вытворчым комплексам, у якім разам з факультэтамі ёсць мноства навукова-даследчых інстытутаў і цэнтраў, вытворчых прадпрыемстваў.

1938 год — амерыканцы, якія настроіліся на хвалю радыёстанцыі CBS (Сі-бі-эс), вырашылі, што пачалася вайна. Паніка ахапіла краіну: людзі кідаліся па вуліцах, шукалі прытулку. Яшчэ б не спалохацца, калі па радыё паведамляюць аб страшным нападзе каварных і злосных марсіян. І няўцям было даверлівым амерыканцам, што Сі-бі-эс транслявала спектакль тэатра «Мэрк'юры» па рамане Герберта Уэлса «Вайна светаў». На наступны дзень рэжысёр спектакля Орсан Уэлс прасіў па радыё ў землякоў прабачэння і здзіўляўся іх легкавернасці. А мог бы падзякаваць за камплімент: мастацкі твор, прыняты за дакументальны, — ці бывае лепшая пахвала рэжысёру?

1947 год — нарадзіўся (горад Баку) Валянцін Мікалаевіч Елізар'еў, балетмайстар, народны артыст Беларусі (1979), народны артыст СССР (1985), акадэмік Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў у Санкт-Пецярбургу (1997), прафесар (1995). З 1973 года — галоўны балетмайстар Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, у 1996—2009-м — дырэктар, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996), шматлікіх конкурсаў балетмайстраў і артыстаў балета, вышэйшай узнагароды Міжнароднай асацыяцыі танца пад эгідай ЮНЕСКА «Бенуа дэ ла данс» (Парыж, 1996).

Было сказана

Васіль БЫКАЎ (1924—2003), народны пісьменнік Беларусі:

«Вопыт няўдач ды пакут нічога не значыць, бо кожнае пакаленне ўсё пачынае спачатку».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

На гарызанталі: Кліпмук. Гагарын. Дзюн. Гад. Лад. Мі-ні. Кулан. Біці. Акно. Код. Бакен. Асобіна. Рак. Лак. Наіб. Камар. Гарпоша. Галітра. Рад. Страла. Сака. Лата. Базар. Снас. Кастэт. Лясо. Яблар. Навідкі.

На вертыкалі: Брас. Мкар. Ціпоў. Адап. Мода. Кіраваш. Танк. Ікона. Раса. Кедр. Дака. Суста. Рагі. Стрэл. Тар. Гадда. Абас. Док. Пяёс. Тон. Каа. Кобрын. Аліса. Пікулі. Таз. Аборка. Кавагнёнак. Адрасані

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.06	17.39	9.33
Віцебск	8.00	17.25	9.25
Магілёў	7.57	17.29	9.32
Гомель	7.49	17.30	9.41
Гродна	8.21	17.55	9.34
Брэст	8.17	18.00	9.43

Месяц

Поўня 29 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Андрэя, Антона, Дзям'яна, Кузьмы.*
К. *Анжэлы, Андрэя, Эдмунда.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+4..+6°С	КІЕЎ	+7..+9°С	РЫГА	+2..+4°С
ВІЛЬНЮС	+1..+3°С	МАСКВА	-1..+1°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-1..+1°С

УСМІХНЕМСЯ

— Татачка! Можна, я цябе пацалую?

— Грошай няма! Мяне ўжо мама пацалавала.

Аб'ява на пад'ездзе:

«Паважаныя дамы, просьба заводзіць палюбоўнікаў з мясцовых: суседзям няма дзе паркавацца!»

— Доктар, які ў вашай паліклініцы класны вартаўнік! Вельмі прывабны мужчына!

— Дык грошай няма... Зарплату выплачваем натурай — пластычнымі аперацыямі.

Сцвярджэнне «Мне няма ў чым хадзіць» звычайна заканчваецца пытаннем: «Ты мяне кахаеш?».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л.ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.473. Індэкс 63850. Зак. № 4865.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 29 кастрычніка 2012 года.